

**Вярнуць 10-бальнай сістэме ведаў яе першапачатковае значэнне…**

СТАР. 4



**У вас будзе дзіця! Падлічым кошт будучай радасці…**

СТАР. 4



**Глен Хэнлан: у хакейстаў аднастайнае жыццё, і зусім не гламурнае**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 СНЕЖНЯ 2013 г. СУБОТА № 236 (27601) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПАТЭНЦЫЯЛ АРМЕЙСКАЙ ЭЛІТЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць развіццё сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі адным з перспектыўных напрамкаў. Аб гэтым ён паведаміў у ходзе наведвання 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Магчыма, не трэба столькі механізаваных часцей, а лепш мець вось такія. Магчыма, для Беларусі такія сілы спецыяльных аперацый — перспектыва». Разам з тым Аляксандр Лукашэнка дадаў: «Магчыма, але вы гэта павінны ўсё дакладна падлічыць і вызначыцца, як будзем развівацца ў будучым».

Прэзідэнт запатрабаваў, каб ва ўсім быў парадак. «Каб тое, што мы бачылі, як ваеннаслужачыя трэніруюцца, было не толькі паказальным мерапрыемствам», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся, як складваюцца ўнутрыкалектыўныя адносіны ў падраздзяленнях, падкрэсліў, што ні ў якім выпадку не павінна быць ніякіх негатыўных праяў, а ў воінскіх калектывах павінен падтрымлівацца добры мікраклімат. Ён адзначыў, што дзедаўшчына недапушчальная.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на неабходнасць выкарыстання патэнцыялу моладзі, якая атрымала тут добрую армейскую загартоўку. «Нам не хапае такой моладзі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Гэтыя маладыя людзі не павінны прапасці — яны павінны абавязкова заняць сваё дастойнае месца ў грамадзянскім жыцці».

Кіраўніку дзяржавы было далажана аб задачах і баявых магчымасцях брыгады, стане і перспектывах развіцця ўзбраенняў, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі сіл спецыяльных аперацый, сродкаў сувязі, вадалазнай амуніцыі і экіпіроўкі.

На вайсковым стрэльбішчы Прэзідэнт азнаёміўся з арганізацыяй баявой падрыхтоўкі ваеннаслужачых брыгады.

Наступным пунктам праграмы наведвання стаў ваенны гарадок, дзе Галоўнакамандуючаму Узброенымі Сіламі было далажана аб стане і магчымасцях вучэбнай матэрыяльнай базы брыгады, умовах пражывання і арганізацыі быту асабовага складу.

## ІНВЕСЦІРУЕМ ШМАТ, АЛЕ ГЭТАГА МАЛА

**Беларусі і Расіі неабходна больш увагі ўдзяляць сумеснай інвестыцыйнай дзейнасці. Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, адкрываючы ў Маскве пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што расійскія кампаніі за апошні год інвесціравалі ў эканоміку Беларусі $5 млрд 140 млн, пры гэтым Беларусь інвесціравала ў Расію амаль $2 млрд.

У Беларусі працуюць 7 банкаў, падкантрольных расійскім фінансавым структурам, іх капітал складае чвэрць усёй беларускай банкаўскай сістэмы. Акрамя таго, у Беларусі дзейнічаюць 2,5 тыс. прадпрыемстваў з расійскім капіталам. У Расіі з удзелам беларускага капіталу працуюць каля 1 тыс. прадпрыемстваў. «Гэтыя лічбы маглі б быць вышэйшымі», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Ён таксама канстатаваў, што ва ўзаемным гандлі зняты многія бар'еры, аднак аб'яднанне прамысловага і фінансавага капіталаў ідзе павольна, не развіты і рынак паслуг. У выніку адкрытасці эканомік Беларусі і Расіі на іх рынкі прыходзяць кампаніі з трэціх краін, канкурыраваць з якімі паасобку беларускім і расійскім пастаўшчыкам паслуг вельмі складана.

Прэм'ер-міністр Беларусі адзначыў, што аб'ектыўным паказчыкам развіцця інтэграцыі з'яўляецца гандаль. У мінулым годзе ён дасягнуў рэкорднага паказчыка — $44 млрд. Аднак, лічыць Міхаіл Мясніковіч, цяпер бакам неабходна актывізаваць работу, паколькі адбываецца зніжэнне ўзаемнага тавараабароту.

Разам з тым, падкрэсліў прэм'ер-міністр Беларусі, Расія прадаўжае заставацца ключавым гандлёвым партнёрам Беларусі. «Беларускае грамадства бачыць эфект ад саюзнай інтэграцыі», — адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі.

### АНОНС «ПРАМОЙ ЛІНІІ»

### УСЕ ПЫТАННІ ГРАШОВА-КРЭДЫТНАЙ ПАЛІТЫКІ

**18 снежня 2013 года з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўны ЕРМАКОВАЙ**. Калі вас хвалююць пытанні стабільнасці курсу беларускага рубля, захавання ўласных зберажэнняў, працэнтаў па ўкладах і крэдытах і любыя іншыя аспекты грашова-крэдытнай палітыкі нашай краіны, — тэлефануйце!

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 287 18 66 і 8 (017) 287 18 71**. Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі **info@zvyazda.minsk.by**.

## ПАЛЯВАЦЬ І РЫБАЧЫЦЬ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**У краіне зацверджана новая рэдакцыя Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства (яны ўступяць у дзеянне праз шэсць месяцаў з моманту апублікавання). Змяненні ў іх абмяркоўваліся падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА. На пытанні адказвалі прадстаўнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь — начальнік упраўлення аналізу і кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага і расліннага свету Аляксандр Драгун, начальнік аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага свету Таццяна Цітова. Таксама ўдзельнічалі ў анлайн-канферэнцыі намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр Корбут і начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі гэтага ж міністэрства Сяргей Шастакоў. «Звязда» друкуе адказы на найбольш актуальныя пытанні.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

### Непажаданых відаў няма

З новай рэдакцыі Правілаў знікла паняцце «непажаданыя віды жывёл». Каментуючы гэта, Сяргей Шастакоў нагадаў пра выпадкі жорсткага абыходжання з такімі жывёламі, у прыватнасці, недапушчальны выпадак з бакланамі, якія адносіліся да непажаданага віду. Новая рэдакцыя Правілаў шырока абмяркоўвалася з грамадскасцю, таму пасля таго выпадку паступала шмат прапаноў неяк змяніць сітуацыю. «Сапраўды, пагадзіцеся, непажаданых відаў быць не можа — усё роўна гэта жывыя істоты. Таму было прынята рашэнне не выкарыстоўваць тэрмін «непажаданыя віды жывёл» — у новай рэдакцыі Правілаў ужываецца проста паняцце паляўнічых жывёл», — сказаў Сяргей Шастакоў.

Што ж тычыцца іх паляўнічага статусу, дык ён змяніўся. У прыватнасці, калі гаварыць пра шэрую чаплю і баклана, дык у новай рэдакцыі Правілаў прадугледжана, што паляванне на іх будзе дазваляцца выключна на рыбаводчых сажалках — там, дзе яны могуць наносіць вялікую шкоду рыбалоўным гаспадаркам.

### Карта пакуль «не лягла»

Апошнія некалькі гадоў даволі актыўна ішло абмеркаванне — уводзіць у краіне платную рыбалку ці не? Былі і прыхільнікі такога кроку і, вядома, праціўнікі.

СТАР. 2

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы:**

*«Надышоў час выступіць з ініцыятывай аб забароне курэння ў грамадскіх месцах. Немагчыма зайсці з дзіцем у памяшканне, дзе кураць. Знаходзіцца там нясцерпна, і пах гэты гадзінамі потым цябе праследуе. А якую шкоду пасіўнае курэнне прыносіць здароўю тых, хто побач, — гэта асобная тэма. Я разумею, якую рэакцыю прапанова аб забароне можа выклікаць у курцоў. Але яны таксама павінны думаць пра тых, хто побач. Гэта, у рэшце рэшт, адбіваецца на здароўі ўсёй нацыі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9440,00 | ▲ |
| Еўра | 12980,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 287,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1139,92 | ▲ |

### Надвор'е

### На выхадныя пахаладае, а потым зноў хлюпота

**Пры павышаным фоне атмасфернага ціску на выхадныя да нас «зазірне» паветраная маса з боку поўначы Еўропы і пахаладае, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідрametцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Атмасферны фронт з боку Польшчы «накрые» нашу краіну ў нядзелю. Паўсюдна будзе ісці кароткачасовы снег, а па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — мокры снег і дождж. Месцамі туман і галалёд, на дарогах слізка. У ноч на нядзелю будзе ад 0 да мінус 6 градусаў, на ўсходзе — 7—12 марозу. Удзень ад мінус 6 па ўсходзе да плюс 3 градусаў на захадзе краіны. Ужо ў пачатку наступнага тыдня Беларусь трапіць пад уплыў цёплых паветраных мас Атлантыкі. Пацяплее. Уначы паўсюдна, а ўдзень — месцамі кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах краіны — туман і галалёд. Тэмпература паветра ў ноч на панядзелак ад мінус 6 на ўсходзе да плюс 2 градусаў на захадзе, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### На слыху

## РАЗУМНЫ БАЛАНС ІНТАРЭСАЎ

**Нарада па пытаннях будаўнічай галіны і кадравай палітыкі, якая прайшла з удзелам кіраўніка дзяржавы 10 снежня, стала галоўнай палітычнай падзеяй тыдня. Пракаментаваць магчымыя новаўвядзенні ў будаўніцтве мы папрасілі намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксея КУЗЬМІЧА.**

### Пра кошт жылля

Вялікі рэзананс выклікала выказаная ў ходзе нарады ў кіраўніка дзяржавы ідэя аб прывязцы цаны жылля да ўзроўню заработнай платы. Улічваючы існуючыя суадносіны гэтых велічынь, пры яе рэалізацыі неабходна выкарыстоўваць карэктуючы каэфіцыент. І на бягучую пяцігодку рабочай групай прапанавана велічыня гэтага каэфіцыента 1,2.

Важна разумець, што цэнаўтварэнне — гэта сістэма ўзаемаўвязаных захадаў. Будаўнікі могуць эканоміць за кошт будаўніча-мантажных работ, за кошт транспартных выдаткаў. Гэта два асноўныя артыкулы, якія рэгулююцца будаўнікамі. Практычна ўсё астатняе ад будаўнікоў не залежыць, паколькі гэта цэны на цэмент, метал, іншыя матэрыялы, электраэнергію і гэтак далей. І трэба разумець, што калі мы ў рэгуляванні перагнём палку, то завядзём будаўнічую галіну ў тупік.

Я лічу, што ў рэгуляванні кошту жылля важна забяспечыць баланс інтарэсаў будаўнікоў і пакупнікоў жылля. Кошт будматэрыялаў рэгулюецца рынкам. Калі ж мы фіксуем цану на квадратны метр, то, на мой погляд, лагічным было б у нейкай форме зафіксаваць і цану будматэрыялаў на час будаўніцтва.

СТАР. 2

## ПАЦВЯРДЖЭННЕ КАТЭГОРЫІ СУМЕСЦЯЦЬ З ПАВЫШЭННЕМ КВАЛІФІКАЦЫІ?

**Тэрміны правядзення атэстацыі педагогаў на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі будуць падоўжаны да 1 верасня 2017 года. Такое паведамленне распаўсюдзіла ўчора прэс-служба Міністэрства адукацыі.**

Нагадаем, што крыху больш як год таму пачала дзейнічаць новая інструкцыя аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў. У Міністэрстве адукацыі, дзе распрацоўваўся гэты дакумент, палічылі, што вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя не можа быць «пажыццёвай узнагародай», а таму кожныя пяць гадоў педагогі павінны свой прафесійны ўзровень пацвярджаць перад «высокай» камісіяй. На пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі педагогам адводзіўся тэрмін да 1 верасня 2014 года. У тым выпадку, калі педагог не паспее ці не пажадае гэта зрабіць, можа быць «разжалаваны» да першай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Што прымусіла галоўнае адукацыйнае ведамства перагледзець сваё рашэнне?

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БРУСЕЛЬ БЛАКІРАВАНЫ АКЦЫЯМІ ПРАТЭСТУ

Шматлікія аўтамабільныя заторы і перабоі з грамадскім транспартам стварылі ў пятніцу праблемы і непрыемнасці жыхарам і прыезджым у Брусэлі з-за акцый пратэсту, арганізаваных адначасова некалькімі прафсаюзамі. З раніцы акцыю распачалі пажарныя. Крыху пазней стартавала акцыя прадстаўнікоў мастацтва. Яшчэ напярэдадні пачалі страйк і цяпер выйшлі на вуліцы работнікі юстыцыі. Забастоўкі персаналу прайшлі ў пенітэнцыярных установах. Патрабаванні пратэстоўцаў звернуты да розных дзяржаўных ведамстваў, але, па сутнасці, яны мала адрозніваюцца. Гаворка ідзе галоўным чынам пра ўмовы працы, адсутнасць перспектыў і недахоп працоўных месцаў.



### У ЕМЕНЕ АМЕРЫКАНСКІ БЕСПІЛОТНІК РАССТРАЛЯЎ ВЯСЕЛЛЕ: 17 ЗАГІНУЛЫХ

У Емене беспілотны лятальны апарат абстраляў вясельны картэж: колькасць загінулых, па апошніх звестках, складае 17 чалавек. Як заявіў прадстаўнік службы бяспекі краіны, сярод ахвяр могуць быць члены тэрарыстычнай групоўкі «Аль-Каіда», але большасць — мірныя грамадзяне. У чацвер вечарам па мясцовым часе амерыканскі беспілотнік нанёс удары па ўдзельніках святочнай цырымоніі ў горадзе Рада.

### ШВЕЙЦАРЦЫ НАВУЧЫЛІСЯ РАЗВОДЗІЦЦА ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

У Швейцарыі ўсё большую папулярнасць набіраюць анлайн-сэрвісы, якія дазваляюць некалькімі клікамі купіць сабе свабоду ад шлюбнай сувязі, як тавар у любой інтэрнэт-краме. Разводы праз сеціва абыходзяцца танней, чым асабісты ўдзел у працэсе, і афармляюцца хутчэй. Па дадзеных швейцарскага эканамічнага часопіса Bilan, першыя сайты анлайн-разводаў з'явіліся яшчэ ў 2007 годзе. «З моманту нашага адкрыцця мы дапамаглі тысячам пар», — распавёў выданню Клаўдыя Бок'я, сузаснавальнік EasyDivorce.ch. Адвакат Жэнеўева Рэйно, якая нядаўна запусціла праект Click-divorce.ch, кажа: «...Мой сайт запрацаваў у ліпені, і я ўжо апрацавала 15 зваротаў. Час турагенцтваў прайшоў, людзі арганізуюць свой адпачынак з дапамогай інтэрнэту. Тое ж адбываецца і з разводамі». Кошт судовых выдаткаў і афармлення анлайн-разводаў у розных кантонах Швейцарыі розны, але ў цэлым ён утрая меншы за выдаткі на звыклую працэдуру. Адзін раз выйсці з дому ўсё ж такі прыйдзецца — каб паўстаць перад судом, які зацвердзіць дагавор аб разводзе. Аналагічныя швейцарскім сэрвісы паспяхова дзейнічаюць і ў іншых краінах.

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СЕНАТ БЕЛЬГІІ ЎХВАЛІЎ ЭЎТАНАЗІЮ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ



Сенат Бельгіі большасцю галасоў (50 супраць 17) падтрымаў законапраект, што распаўсюджвае на непаўналетніх закон ад 2002 года, які дазваляе эўтаназію для цяжкахворых дарослых, паведамляе The New York Times. Згодна з законапраектам, невылечна хворыя непаўналетнія пацыенты могуць папрасіць аб эўтаназіі ў тым выпадку, калі іх боль невыносны і спосабаў яго палягчэння не існуе, а таксама калі хвароба ў бліжэйшы час прывядзе да смяротнага зыходу. Падчас гарачых грамадскіх дэбатаў, якія папярэднічалі прыняццю законапраекта, рэлігійныя лідары асудзілі гэты крок як заснаваны на «логіцы, якая разбурае асновы грамадства».

## КНІГА ЯК СВЕДЧАННЕ ДАБРАЧЫННАСЦІ

**У Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь прайшоў традыцыйны Калядны дабрачынны баль кнігі. Яго правядзенне стала добрай праднавагодняй традыцыяй. У эпіцэнтры сапраўднага свята кнігі — аўкцыён па продажы найбольш цікавых выданняў некалькіх апошніх гадоў.**

Усё было так, як на самых славутых аўкцыёнах — тое ж хваляванне, строгія правілы, тое ж жаданне апярэдзіць адзін аднаго ў куплі прывабнага лота. А ўсяго лотаў вызначылі 43. Летась, дарэчы, іх было менш за 30. Спярша прапанавалі да продажу кнігі па тэме «Вытокі». «Баркалабаўскі летапіс» (зразумела, факсімільнае выданне «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі») набылі за 3,5 мільёна рублёў. А старт пачынаўся з 800 тысяч...



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Кнігу «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі» абвясцілі на продаж за 100 тысяч рублёў. А ў выніку арганізатары аўкцыёну атрымалі за невялікага памеру кнігу 3 мільёны 600 тысяч рублёў. «Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі» (альбом Юрыя Малаша прапанаваў да продажу выдавецкі дом «Звязда») пры наміналe ў 100 тысяч рублёў прадалі за 2 мільёны 100 тысяч... І такіх уражальных прыкладаў нямала. Была і тэма з некалькіх лотаў — «Кніга з аўтографам». Арганізатары прапанавалі кнігі Генадзя Пашкова, Валянціны Паліканінай, Юліі Навіцкай, Мікалая Чаргінца, Тамары Лісіцкай, зборнік перакладаў Міколы Мятліцкага «Пад крыламі Дракона. Сто паэтаў Кітая». Усяго ў выніку сродкі, заробленыя на аўкцыёне, склалі болей як 65 мільёнаў рублёў. У параўнанні з леташнімі прыбыткамі — рост у два разы!



Фота БЕЛТА.

— Мне думаецца, што кніжны калядны аўкцыён — важная традыцыя, якая будзе і надалей развівацца, — заўважыла **першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ,** падсумоўваючы вынікі гэтага свята кнігі. — Прыемна, што лідарамі па продажы сталі дзяржаўныя выдавецтвы. Гэта яшчэ і сведчанне таго, што ў нас у краіне кнігавыдавецкая галіна з'яўляецца прывабным складнікам нашага жыцця. Зараз выдавецтвы складаюць свае планы, заглядваюць у заўтрашні дзень. Несумненна, і цікавасць удзельнікаў аўкцыёну стане для ўсіх падказкай у вызначэнні тых ці іншых тэм, тых ці іншых творчых праектаў.

Другі дзень VII Міжнароднай канферэнцыі выдаўцоў, паліграфістаў і распаўсюджвальнікаў друку прайшоў у дзелавой атмасферы. Асноўная ўвага была нададзена агляду рынкаў друку Беларусі, Расіі і Казахстана.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

ISSN 1990 - 763X

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2014 года!**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 | 285 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 | 256 500 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 | 571 800 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 | 514 800 |

# У «Беларусі» — МЕСЯЦ ЗНІЖАК І ПАДАРУНКАЎ



Прыгожа аздобленыя вітрыны ствараюць святочны настрой.

У снежні гандаль цалкам гатовы да калядна-навагодніх свят. Сваю падрыхтоўку запрашае ацаніць і ўнівермаг «Беларусь»: вітрыны, над якімі працавалі таленавітыя дызайнеры, афармленне секцый, якое адразу стварае адпаведны настрой, нарэшце, асартымент тавараў па выгадным кошце. Снежань — самы выгадны для пакупак месяц. Не прапусціце зніжкі!

— Першы паверх універмага перажыў сёлета сур'ёзнае абнаўленне, — кажа **дырэктар УП «Універмаг Беларусь» Мікалай МЯТЛІЦКІ.** — Цяпер тут замест васьмі секцый размяшчаюцца чатыры салоны — бытавой тэхнікі, посуду, парфумы і харчовых тавараў. Для кожнага салона набыта новае абсталяванне, гандаль арганізаваны па прынцыпе самаабслугоўвання. Былі заменены і эскалатар, што, здаецца, ацанілі нашы пакупнікі, паколькі, размешчаны ў цэнтры, ён адначасова і зручны, і проста служыць упрыгажэннем гандлёвай тэрыторыі. У наступным годзе мяркуем, працягнем абнаўленне іншых паверхаў. У першай палове года плануем замяніць кандыцыянеры.



Прадавец Валерыя КОСАРАВА: «Самыя прыгожыя і пушыстыя елкі — у нас!».

## Спецпрапанова

*У лістападзе ўсе сталічныя ўнівермагі, у тым ліку і «Беларусь», праводзілі аднадзённую акцыю па зніжэнні кошту ўсіх тавараў на 15 працэнтаў. Пакупнікі не ўпусцілі магчымасці набыць у гэты дзень бытавую тэхніку, дываны, ювелірныя вырабы, адзенне, абутак. Нават у аддзеле панчох і шкарпэтак не зніжала чарга.

*Ва ўнівермагу «Беларусь» **да 9 лютага будзе працаваць спецыяльная секцыя тавараў з сімволікай чэмпіянату свету па хакеі-2014.** «Фуфайкі, ручнікі, магніты і шэраг іншай драбязы айчыннай вытворчасці набываюць не толькі расійскія госці, але і беларусы, якія, верагодна, рыхтуюць сабе «амуніцыю» будучых балельшчыкаў», — адзначае **прадавец секцыі Таццяна СІКІРЫЦКАЯ.**



Прадавец Таццяна СІКІРЫЦКАЯ прапануе разнастайную прадукцыю з лагатыпам чэмпіянату свету па хакеі-2014.

## А хоць бы і піхта!

Ужо напрыканцы лістапада ўнівермаг быў амаль поўнасцю навагоднім. Завяршылася афармленне вітрын, інтэр'ераў гандлёвых залаў і навакольных тэрыторый. Цяпер на першым паверсе размясціўся і любімы маленькімі наведвальнікамі «музычны» Дзед Мароз.

Ідэя асноўнай вітрыны абмяркоўваецца яшчэ восенню. Мастакі распрацоўваюць тэму з выкарыстаннем казачных персанажаў, светлавой тэхнікі, гірляндаў, шароў. На галоўным уваходзе ўжо некалькі месяцаў свеціцца рэкламнымі аб'явамі святлодыёдны экран, які не толькі дзеліцца карыснай інфармацыяй пра акцыі ва ўнівермагу, але і ўмацоўвае святочны настрой цёплымі віншаваннямі.

Распачаўся гандаль штучнымі елкамі — як у самім універмагу, так і на вуліцы. Жывыя елкі, вядома, нашы, айчынныя, а вось штучныя — у тым ліку і расійскай, кітайскай вытворчасці. Даўжыня — ад 15 см да 2,5 м. Прапануюцца піхта, елка, сасна. Афарбоўка — зялёная, беласнежная, серабрыстая, з напыленнем.

Сярод навагодніх сувеніраў — керамічныя, шкляныя вырабы з сімвалам Года Каня, нават лялька-караоке. Ёлачныя цацкі — самых розных формаў, памераў, электрагірлянды і хлапушкі. Ёсць і цацкі пад ёлку — дзед Мароз са Снягуркай айчыннай вытворчасці.


УНІВЕРМАГ БЕЛАРУСЬ

**НАШ АДРАС:**
г. Мінск, вул. Жылуновіча, д. 4

Рэжым працы ўнівермага:
- 26–28, 30 снежня – 9.00–22.00
- 25, 29, 31 снежня – 9.00–21.00
- 2–7 студзеня – 9.00–21.00
- 1 студзеня – выхадны.




Новы эскалатар дапамагае з камфортам наведаць усе паверхі ўнівермага.

## Падарунак для імянінніка

На працягу года ўнівермаг праводзіць штомесячную акцыю «Дзень нараджэння з універмагам «Беларусь». Пакупнікі, якія нарадзіліся ў пэўны месяц, атрымліваюць магчымасць у спецыяльны дзень прыйсці, каб атрымаць падарунак — **15-працэнтную зніжку на любыя віды тавараў.** Што характэрна, ахвотнікаў да такога падарунка было нямала, аб чым сведчыла трохразовае павелічэнне тавараабароту ў дні акцыі. Хутчэй за ўсё, «дні імяніннікаў» зацікаўляць і ў наступным годзе.

Прыязджаюць па пакупкі не толькі жыхары сталіцы, але нават з іншых да Мінска раёнаў. Зніжкі не распаўсюджваюцца на тавары, кошт якіх не перавышае 10 тысяч рублёў, і на харчовую групу. Дарэчы, толькі ў харчовым аддзеле вы знойдзеце самую смачную выпечку і вяршковы дэсерт «Пінгвін», якія робяць повары сталовай універмага. Зразумела, што гэтымі днямі прапануецца дастатковая колькасць шампанскага і салодкіх падарункаў — абавязковых спадарожнікаў калядна-навагодніх свят.

## Удвая прыемна

На працягу снежня шэраг буйных вытворцаў прамысловых тавараў прываблівають пакупнікоў падарункамі ды нізкімі цэнамі.

Са зніжкамі **ад 10 да 20 працэнтаў** ад адпускнога кошту свае вырабы прапануюць прадпрыемствы «Вясняначка», «Калінка», «Сцяг індустрыялізацыі», Дзяржынская швейная фабрыка «Эліз», «Камінтэрн», «Элема», «Вегасторг», «Марка», «Сола-Пінск», «Бабруйсктрыкатаж», «Лінж», «Торса», «Алеся».

**Праводзяцца акцыі са зніжкамі на:**

скургалантарэйныя тавары (РФ); мэблевыя тканіны (Кітай); прадукцыю ААТ «Галантэя»; махровыя ручнікі (Пакістан); прадукцыю ААТ «Сукно»; дарожныя сумкі і дзелавы асартымент гандлёвай маркі «borZa»; пледы імпартнай вытворчасці; прадукцыю тэкстыльнай фабрыкі РЫМАКА, халадзільнікі, маразільнікі, пральныя машыны айчыннай вытворчасці; падлогавыя пліты ААТ «Электраапаратура» і гандлёвай маркі «Гефест»; мікрахвалевыя печы гандлёвых марак «Гарызонт» і «Мідэа»; пыласосы гандлёвых марак «Гарызонт» і «Віцязь»; тэрмасы са шкляной колбай (Кітай); пухова-пер'евыя вырабы ААТ «Квасевіцкая пухова-пер'евая фабрыка»; тэлевізары айчыннай і замежнай вытворчасці; садовыя арэлі айчыннай вытворчасці; ювелірныя вырабы ТАА «Ювелірны завод «Эгрэт» і СТАА «Ювелірны завод «Зорка».



Вялікі выбар навагодняй прадукцыі парадуе нават самага патрабавальнага пакупніка. На фота: прадавец Алена ТРОЦКАЯ.

**У снежні пры набыцці:**

✓ вырабаў ААТ «Рэчыцкі тэкстыль» на суму 100 тысяч рублёў — махровы ручнік;

✓ тканін вытворчасці РФ на суму 150 тысяч рублёў — ручнік з рагожкі;

✓ парфумерна-касметычнай прадукцыі вытворчасці ТАА «Экста» на суму ад 40 тысяч рублёў — бальзам-эмульсія або дзённы крэм-ліфт;

✓ парфумерна-касметычнай прадукцыі вытворчасці ТАА «Флараліс» на суму ад 40 тысяч рублёў — тонік для твару;

✓ фарфоравага посуду ЗАТ «Добрушскі фарфоравы завод» на суму звыш 100 тысяч рублёў — сувенір-сімвал гэтага года;

✓ свяцільняў (Польшча) на суму звыш 500 тысяч рублёў — камплектаванне лямпачкамі;

✓ свяцільняў ТАА «Гейрыў-Лайт» на суму 200 тысяч рублёў — начнік-свяцільня.

**15 снежня аб'яўляецца акцыя «Калядныя зніжкі» з прадастаўленнем 15-працэнтнай зніжкі ад рознічнага кошту на ўсе прамысловыя тавары коштам вышэй за 10 тысяч рублёў.**

**зніжка 15%**

**22 снежня — «Дзень нараджэння з універмагам «Беларусь» з прадастаўленнем 15 працэнтаў зніжкі ад рознічнага кошту на ўсе прамысловыя тавары коштам звыш 10 тысяч рублёў для ўсіх, хто нарадзіўся ў снежні.**

**Алена ДАЎЖАНОК, Святлана БАРЫСЕНКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

УНП 100098469




## І ТАТА ЗРАЗУМЕЕ

...З настаўніцкай працай я развіталася даўно, 16 гадоў таму, але школа мне сніцца дагэтуль. Здаецца усё, што на ўроку чужыя, з нейкай чарговай праверкай, а ў класе шум, вучні не слухаюць... Прачынаюся, карацей, у халодным поце...

На самой жа справе з дзецьмі ў нас былі цудоўныя адносіны. Я любіла гэтых малых чалавечкаў, а яны, трэба разумець, любілі мяне, бо часта называлі мамай.

Дык вось, неяк на ўроку чытаем мы верш Пімена Панчанкі пра касманаўтаў, размаўляем з вучнямі пра нашага Клімука, пра Кавалёнка. Пытаюся:

— Дзеці, можа, якія словы вам незразумелыя?

Маўчанне.

— Тады, — працягваю, — скажыце мне, хто такія землякі?

Першым падымае руку Толя і кажа:

— Я ведаю! Гэта — жукі... Яны жывуць у зямлі.

Клас — у рогат.

А неяк і не да смеху нам было. Чыталі, напрыклад, верш «Слава хлебу на стале», гутарылі аб тым, які гэта каштоўны прадукт, як ён цяжка хлебаробам даецца, як яго трэба берагчы...

— А мой тата, — хваліцца Саша, — з хлеба дзве бутлі гарэлкі выгнаў!

Я здранцвела, разгубілася. Пасля паўзы кажу:

— Саша, прачытай гэты верш тату, — ён зразумее, што зрабіў няправільна.

...Цяпер у Сашы свае два сынкі. Ён добры бацька. І наогул, я радуюся, што ўсе мае вучні сталі дастойнымі людзьмі.

**Аляксандра САРОКА,** *в. Шашкі, Стаўбцоўскі раён.*

## КАБ НЕ ТОЕ ФУТРА...

Гэта відавочна: мы, людзі, вырашаем лёс сваіх рэчаў (купляем, носім, перашываем, некаму аддаём або выкідваем...). Але ж бывае і наадварот. Вы не верыце? Тады паслухайце.

Адна мая сваячка ў савецкія часы закончыла школу, паступіла ў тэхнікум і на першым жа курсе... закахалася. У каго? Ды ў выпускніка, можна сказаць... А ўжо ж разумнага, прыгожага...

Карацей, для самай звычайнай (як яна лічыла...), вясковай дзяўчынкі ён быў не проста марай — марай з ліку недасяжных...

Але ж цуды ў жыцці хоць зрэдку здараюцца: на навагоднім вечары той прыгажун яе заўважыў (!), яны танцавалі (!). І ён (сэрца з грудзей!) нават сабраўся праводзіць яе — аж да самага інтэрната!

Дзяўчыне б подбегам... Але на вуліцы холад, зіма, а апранаць трэба старое (яшчэ з сёмага класа) шэрае штучнае футра. Яна забрала яго з гардэроба, але «прыбрацца» і паказацца ў ім на ясныя вочы Вадзіма...

Ну не змагла! Скруціла сваю адзежыну падкладкай наверх, заціснула ў ахапак і «нырнула» пад лесвіцу.

Адтуль, праз заслону слёз, яна бачыла, як каля ўваходных дзвярэй з нагі на нагу пераступае той прыгажун, шукаючы яе, чакаючы.

...Зусім нядаўна, асвоіўшы камп'ютар, сваячка зайшла ў «Аднакласнікі», адшукала там сваё першае каханне, адправіла ліст — нагадала яму той навагодні вечар і тую дзяўчынку. Ён, як высветлілася, помніў яе!.. Спытаў: куды яна тады прапала? Прыйшлося расказаць — пра сваё шэрае футра, пра слёзы, пра лесвіцу... «От ужо гэтыя дзеўкі!» — засмяяўся Вадзім.

А наогул, як высветлілася, іх жыцці склаліся досыць падобная — абое самадастатковыя, абое не без талентаў, не без пасад, не без сем'яў... Што цікава, у абодвух — па чацвёра дзяцей.

Сваячка, вядома ж, любіць сваіх, любіць бясконца! Але, гледзячы на мужа (вечна хмурага, скупаватага) не-не ды і падумае: «Каб яно правалілася, тое чортава футра!»

**Таццяна РАМАНАВА,** *г . Наваполацк.*

## АХ, ЧОРНЫ «МЕРСЕДЭС»...

З Алай гады тры таму мы адпачывалі ў пансіянаце на возеры Свіцязь. Потым, як водзіцца, абмяняліся нумарамі тэлефонаў, час ад часу перамаўляліся, але ж вельмі рэдка...

У той дзень мы з братам паехалі ў вёску да бацькоў. Бульба там была выбрана, буслы, за якімі так цікава было назіраць, адляцелі... Я засумаваў, у галаву палезлі нядобрыя думкі. Але ж яны, як пісаў філосаф, што тыя стрэлы: куды накіруеш — туды і паляцяць.

Каб памяняць кірунак, я чамусьці ўспомніў Алу — хацеў патэлефанаваць ёй, але затым раздумаў: «Дай пашлю SMS-ку... З іншага тэлефона...» Уставіў сімкартку, набраў: «Прывітанне, малая, як ты жывеш?». Адправіў. Уявіў: вось яна атрымала — ад нейкага незнаёмца, чытае... А што пасля? Сцірае? Адпраўляе SMS-ку ў адказ? Гляджу, не, яна тэлефануе! Пытаецца ў мяне:

— Ты хто?

Я пачынаю ліхаманкава думаць.

— Віктар, — кажу, заціснуўшы нос пальцамі і змяніўшы голас. — Ты што — мяне не помніш? Мы пазнаёміліся на дыскатэцы «Калізей».

— Так, я там была, — прызнаецца дзяўчына *(а я рэкламу па радыё чуў. —* **Аўт.***)*. — Але ж ніякага Віктара нешта не помню.

— Ну як жа? Ты — сярэдняга росту, стройная, бландзінка... Табе гадоў 20? Так? Вось, у мяне ў тэлефоне запісана: Ала. І твой нумар... Зрэшты, я, можа, забыў? Можа, мы недзе так пазнаёміліся?

Ала замоўкла, мабыць, напружыўшы памяць. Але ж як ты ўспомніш тое, чаго не было?

— Не, — прызнаецца, — не помню.

— Дык няма нічога прасцей, — не здаюся я, — давай сустрэнемся *(я ў вёсцы, за 300 вёрст! —* **Аўт.***)*, недзе пасядзім, вып'ем кавы, паглядзім адно на аднаго...

— Калі? — пытае дзяўчына

— Ды можна і сёння. Ты цяпер дзе?

— Да пяці гадзін на працы.

— Добра, я пад'еду — у пяць на чорным «Мерседэсе» з букетам белых руж. Скажы толькі, дзе ты працуеш. Куды мне ехаць?

Дзяўчына назвала адрас.

Значыць, што называецца, клюнула, «павялася»?.. Дык зараз ужо не сарвецца!.. Ну дзіва што! Чорны «Мерседэс», белыя ружы...

Да 5 гадзін я святкаваў, бо нешта падобнае перажываў, хіба што гуляючы ў шахматы: ты хітрыш, тады выбудоўваеш пастку, праводзіш камбінацыю і... Выйграеш!

У 5.10 яна пазваніла, спытала:

— Ты дзе?

Пачынаю вешаць локшыну на вушы:

— Прабач, зараз буду. Мяне тут мянты тармазнулі, зараз выпішуць штраф. Пачакай трохі, га?

— Добра, — неахвотна згаджаецца Ала, хоць у голасе ўжо чуваць раздражненне...

У 5.25 яна тэлефануе яшчэ раз:

— Так, я іду дахаты, — кажа, не ўтойваючы гневу.

— І правільна, ідзі, — адказваю ёй ужо сваім сапраўдным голасам. — Не будзе сёння ні «Мерседэса», ні белых руж...

— Алег? Гэта ты? Гад, — крычыць дзяўчына. — Ды як ты мог?

— А цябе што — ніхто ніколі не разыгрываў? Тады віншую з дэбютам...

Увечары яна патэлефанавала мне яшчэ раз і ўжо спакойна сказала:

— Ну ты малайчына — павучыў, як давяраць незнаёмцам... Развёў мяне!.. Але ж так прыгожа!

— Ты не крыўдзішся?

— Не, ты што?

...Я часта ўспамінаю гэты розыгрыш (хоць паўтараць нікому не раю...).

Ала, магчыма, помніць таксама. Хаця б таму, што яшчэ ніколі, відаць, прынц на чорным «Мерседэсе» і з букетам белых руж не быў ад яе так блізка.

**Алег СЯМАШКА,** *г. Баранавічы*

## ВОСЬ ТАКОЕ ВЯСЕЛЛЕ

Што не дзіва, у мінулым стагоддзі многае рабілася зусім не так, як цяпер. Узяць, напрыклад, вяселлі. Хто ў 1960-я — 1970-я гады мог дазволіць сабе нейкі шык ды вялікі збор? Я такіх не ведаю. Усе, здаецца, гулялі ціха, сціпла, у хаце жаніха або нявесты. Хто-ніхто хіба запрашаў гасцей у нейкую сталовую ці кавярню...

Ну дык вось. Кватэр у нашым драўляным двухпавярховым доме было восем, сем'яў — вядома ж — значна больш. Галоўнае — ніхто ні з кім не сварыўся, усе жылі дружна, разам дзялілі і гора, і шчасце.

Яно якраз і чакалася: у нашых суседзяў з другога паверха — у Рывы і Самуіла — занявесцілася дачка. Бацькі сталі рыхтаваць вяселле, мы ўсім домам — ім дапамагаць...

Усё паспелі, усё зрабілі! І, вядома ж, усе былі потым запрошаны. У тым ліку і Лазар...

Ён у нашым доме адметны быў. Хаця б тым, што, працуючы на рынку секарам мяса, неяк прывык да гарэлкі. Прычым выпіць любіў не чарку-другую (гэта яму што слану шраціна была), а як мінімум паўлітра...

Дык, значыць, сышліся ўсе, паселі за сталы, налілі па чарцы. Маладых павіншавалі іх родныя бацькі.

Усё правільна: астатнія госці свае пажаданні пакідаюць пры сабе, бо яно ж, як меркавалі, неаднойчы будуць чаркі падымаць.

Выпіўшы па першай, схіліліся над талеркамі, сталі закусваць. Закусіўшы — пераглядвацца паміж сабой у чаканні, што зараз жа нехта налье, нешта скажа. Аднак слова ніхто нікому не даваў. І самастойна яго ўзяць ніхто не асмельваўся. Павісла цішыня.

Як і варта было чакаць, парушыў яе Лазар.

— Сёма, — досыць гучна прамовіў ён, — ты, можа, нальеш нам яшчэ па адной?

Гаспадар падняўся з месца, узяў у рукі пляшку з гарэлкай, спытаў у прысутных.

— Ну, і хто тут хоча, каб я наліў?

Госці сарамліва апусцілі вочы ў талеркі — далікатна прамаўчалі.

— Ну вось бачыш, — звярнуўся Самуіл да Лазара, — ніхто не хоча. А ты кажаш «налі»...

Вось такое ў нашым доме было вяселле — мякка кажучы, не вясёлае. Але ж пажаданні маладым суседзі сказалі — на абсалютна цвярозую галаву, пры развітанні, ідучы дадому.

**Раіса ВАСІЛЬЕВА,** *г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж (і заўсёднае) пішыце!***

## ЛЮДСКІЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫРАШАЮЦЬ... ЛЮДЗІ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Даўнары Стаўбцоўскага раёна патэлефанавала Тамара Іванаўна Прычынец з праблемай, характэрнай для гэтай пары года: наконт вулічнага асвятлення. У гэтым выпадку праблему ўскладняла тое, што справа датычылася сямігадовага дзіцяці.**

— Яго забірае школьны аўтобус. Кіроўца ўвесь час лаецца наконт бяспекі, бо насупраць дома не гарыць ліхтар. Да таго ж стаяць аднаму ў цемры дзіцяці страшна — даводзіцца быць побач, пакуль не пад'едзе аўтобус. Звярталіся з праблемай у сельскі Савет. Адтуль накіравалі да сувязістаў. А тыя, у сваю чаргу, параілі дабівацца свайго праз сельскі Савет, — даводзіла нам Тамара Іванаўна.

Трэба зазначыць, што 6 снежня ў «Звяздзе» пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў надрукаваны матэрыял «Дапамажыце вярнуць ліхтар. Яшчэ ўвесну яго забралі». Нагодай для яго падрыхтоўкі стала скарга Леакадзіі Іосіфаўны Чэрнік з той самай вёскі Даўнары, што і цяперашняя наша заяўніца. Тады гаворка ішла пра адсутнасць вулічнага асвятлення ў самым пачатку населенага пункта. Праз некалькі дзён пасля публікацыі Леакадзія Іосіфаўна зноў патэлефанавала ў рэдакцыю, каб падзякаваць: ліхтар вярнулі на ранейшае месца. А днямі і начальнік раённых электрасетак Вадзім Качановіч даслаў афіцыйны адказ.

«Па звароце на «гарачую лінію» вашай газеты жыхаркі вёскі Даўнары Чэрнік Леакадзіі Іосіфаўны паведамляем, што, згодна з пісьмом сельскага Савета ад 10.12.2012 г. аб адключэнні святлокропак, была адключана і знята з апоры электраперадач вулічная свяцільня.

Пасля вашага званка 5.12.2013 г. свяцільня была ўстаноўлена на апору, аб чым пісьмом паведамілі старшыні Рубяжэвіцкага сельскага Савета».

Мы падзякавалі начальніку раённых электрасетак за аператыўна вырашаную праблему і адказ і адначасова перадалі сутнасць звароту чарговай заяўніцы з вёскі Даўнары.

— Калі гаварыць пра першы выпадак, тады старшыня сельскага Савета праехалася па вёсцы і прыняла рашэнне, што ў тым месцы ліхтар не патрэбны. Наша арганізацыя сама па сабе не можа здымаць і вешаць вулічныя ліхтары. Мы працуем па пісьмах сельскіх Саветаў, якія вырашаюць, дзе ім быць, і дзе не. Як правіла, гаворка ідзе пра пачатак і заканчэнне населенага пункта і месцы масавага знаходжання людзей — напрыклад, каля крамы ці клуба. У гэтых выпадках ліхтары павінны быць абавязкова, — патлумачыў Вадзім Леанідавіч. — Таму мы звярнуліся да старшыні сельскага Савета, каб яна зноў праехалася па вёсцы, паглядзела і вырашыла, дзе павінна быць вулічнае асвятленне. Пасля ўзгаднення ў райвыканкаме гэтых месцаў мы будзем гатовы павесіць там ліхтары.

**P.S.** *У нумары газеты ад 7 снежня пад той жа рубрыкай «Гарачы» тэлефон» гаварылася аб праблеме, што закранула жыхарку шматкватэрнага дома ў мікрараёне-1 Заслаўя Лідзію Андрэеўну Казак і яе суседзяў — «Чаму ў кватэры змоўкла радыё?». Наша чытачка мае шаноўны ўзрост (ёй ідзе 91-ы год) па гэтай прычыне шмат глядзець тэлевізар яна не можа. А навінамі вельмі цікавіцца, таму, калі з месяц назад змоўкла радыё, жанчыне стала вельмі сумна, бо яго яна слухала цягам усяго дня. Пасля ўмяшання газеты Лідзія Андрэеўна нам падзякавала: радыё нарэшце зноў загаварыла. Гэта пацвердзіў у тэлефоннай гутарцы з рэдакцыяй і намеснік начальніка Мінскага раённага цэха электрасувязі па лінейных збудаваннях Андрэй Жаркевіч, які сам набраў наш нумар: усё зроблена, бабуля задаволена. Ад рэдакцыі ж хацелася б дадаць толькі адно ў адрас двух вышэйназваных спецыялістаў: як добра, калі людзі пры пасадах ставяцца да выканання сваіх прафесійных абавязкаў належным чынам. І не забываюцца пры гэтым пра людскасць стасункаў.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## Чакае свята Імянін

*Хлебаробам СВК «Імянінскі» Драгічынскага раёна*

*Віншаванне з Новым годам*
*Шлём аратым, пастухам,*
*Усім руплівым садаводам,*
*І тым, хто ў вёсцы ўзводзіў Храм.*

*Найбольш шануем працалюбаў —*
*Для іх і гонар, і хвала:*
*І хто шчыруе ў сельскіх клубах,*
*А ў кузні — з гартам каваля.*

*Усім жадаем даўгалецця,*
*Барознаў доўгіх, шчодрых ніў,*
*І хто трымае моцна лейцы,*
*Свой лёс з зямелькай парадніў.*

*Ля ёлкі вёскай заспяваем —*
*Чакае свята Імянін!*
*Здаўна тут важкім караваем*
*Жыццё мацуе селянін.*

*А потым разам на Каляды*
*Па хатах пойдзем шчадраваць,*
*І будзем нашым святам рады,*
*Як ліўням цёплым сенажаць.*

**Праўленне СВК «Імянінскі».**

■ Размовы на кухні

# У вас будзе дзіця!



**Мінулым разам мы разбіраліся, куды лепш укладваць грошы. І прыйшлі да высновы, што найбольш правільна не шкадаваць фінансаў на сям'ю, а дакладней — на дзяцей. Адразу трэба ўдакладніць, што адзін з суразмоўцаў ужо мае траіх дзетак, а другі (значна маладзейшы) гэтым летам ажаніўся, а значыць «пялёначная» тэма яму неўзабаве стане блізкай. «Старэйшы брат» вырашыў перадаць вопыт новаму пакаленню ў асобе маладога журналіста, з якім зноў-такі пачаў спрачацца.**



## Мацярынскі капітал

**С.К.** — Пры нараджэнні маёй першай дачкі (амаль 17 гадоў таму) мая жонка атрымала ад дзяржавы разавую выплату ў памеры яўна меншым за 100 долараў. Дакладную лічбу ні я, ні жонка ўжо не памятаем, але тыя грошы разышліся на розныя дробязі імгнення — мы іх нават не заўважылі. А цяпер жа вас, маладых, дзяржава «песціць»: наколькі мне вядома, цяпер пры нараджэнні першага малога плацяць амаль 10 з паловай мільёнаў. А гэта больш за тысячу долараў. Зразумела, што жыццё сёння сур'ёзна падаражэла, але пагадзіся, што сям'ю з дзецьмі падтрымліваць сталі значна лепей...

**У.К.** — Вы лічыце, што гэта шмат? Добра. Скажам, атрымалі мы гэтыя грошы. Што тады я змагу за іх набыць? Давайце паглядзім, што нам трэба: па-першае, ложачак, па-другое, каляска, і няхай тое-сёе з рэчаў... Хоць мы яшчэ забыліся пра ванначку, пра дапаўненні да ложка — матрасік, бялізну (а гэта часам яшчэ даражэй абыходзіцца). Добра, калі я ўсё пералічанае і куплю. Але ж гэта далёка не поўны спіс.

**С.К.** — Не спяшайся ты, хлопец, набываць бялізну. Мы яшчэ не ўсё падлічылі. Твая прыгажуня, калі прыйдзе час, атрымае бюджэт пражытковага мінімуму (сёння гэта трошкі больш за 1 мільён) толькі за тое, што своечасова стане на ўлік у паліклініку. А потым будзе атрымліваць на малога амаль два мільёны, што адпавядае 35% ад сярэдняга заробку па краіне. Згодзен, што не пашыкуеш. Разам з тым і табе на пачатку сямейнага шляху будзе лягчэй сумесны бюджэт «склейваць». А яшчэ нагадаю, што за другога і наступнага «нашчадка» дзяржава вам аднаразова па чатырнаццаць пражытковых бюджэтаў «адваліць». А гэта ўжо паўтары тысячы «зялёных».

**У.К.** — Пр-р-р, Сяргей Андрэевіч, пачакайце. Дазвольце пакуль аб адным памарыць. Вы мне лепш дайце практычныя парады...

**С.К.** — Добра. Раю табе, хлопча, усё ж такі не надта спадзявацца на дзяржаву. Грошыкі табе дадуць, але ж не адразу, а толькі тады, калі зарэгіструеш дзіця ў ЗАГСе. Таму, на маю думку, мужчына і самастойна павінен падрыхтавацца да прадаўжэння роду. Нядрэнна было б назапасіць якую тысячу долараў. Гэта могуць быць грошы, якія вам на вяселле падаравалі. Ды і мужыку цяпер больш варушыцца трэба, каб зарабляць не толькі на сябе. А вось табе мая галоўная практычная парада — нараджай адразу трайню! Атрымаеш статус шматдзетнага бацькі, у гарвыканкаме цябе запішуць на асобны жыллёвы ўлік, дадуць ільготны крэдыт пад 1 працэнт на сорак гадоў. Тады сваю кватэрную праблему ты цалкам і закрыеш. Гэта я пра глабальнае... Ну а зараз давай і пра ложак пагаворым. Слухаю цябе, будучы тата.

## Каб самому хацелася спаць...

**У.К.** — Значыць так... Мы ўжо з жонкай прыцэньваліся патроху, таму магу вам агучыць пэўныя вынікі «разведкі». Ложкаў тых цяпер, вядома, безліч. І цэны на іх таксама розныя: ад тысяч 700-800 за звычайныя, нават без «маятніка», да 2,5-4 мільёнаў за трансформеры з шуфлядамі і тумбачкай. Ёсць і зусім спрошчаныя пластмасавыя варыянты — ложак і манежык адначасова. Але такое мы нават не разглядаем, бо там дзіця будзе занадта нізка ляжаць, а гэта шкодна для яго — кажуць, што шмат пылу і можа быць алергія. І новаспечанай маці, акрамя таго, будзе складана нахіляцца да майго сына (хто ж яшчэ можа быць?) так нізка. А ў вашых дзяцей які быў?

**С.К.** — Эх, дружа, што ж ты раней пра свае планы маўчаў? Сёння роўна чатыры месяцы, як я сваю драўляную «баюшку» знаёмым у суседні пад'езд аддаў. Так бы табе перайшла па спадчыне. Наконт пластыку заўважу адназначна — ніякага пластыку вам не трэба! Ды і зусім танны ложак я б не параіў. На мой розум, патрэбен толькі надзейны драўляны ложак, у якім бы і самому захацелася спаць. Каб не «пасыпаўся» праз два-тры гады, а мо і раней. Усе мае дзеткі (па чарзе) у адным ложку цудоўна гадаваліся, і потым нават у «дарослы» ложак не вельмі спяшаліся.

**У.К.** — Здаецца, і мы на адным малым спыняцца не збіраемся. На кожнага ложак купляць — гэта ўжо занадта. Мы такое дакладна не пацягнем. Нам бы нейкі больш бюджэтны варыянт.

**С.К.** — У мяне ў свой час таксама грошай было няшмат. Адшукаў я нашу цудоўную «калыску» праз газету «Из рук в руки». Пашанцавала. За два долары купіў. У добрых і акуратных людзей. Сёння ў небагатых сем'яў варыянтаў значна больш. У інтэрнэце шмат падобных сайтаў, дзе дзіцячую мэблю (у тым ліку і ложкі) аддаюць проста «ў добрыя рукі» — за «дзякуй». Галоўнае, каб табе гэты ложак ад шчырага сэрца падаравалі. Але ў гэтым выпадку ты абавязкова з жонкай парайся. У цяжарных жанчын розныя забабоны бываюць.

**У.К.** — Але ж усё астатняе за «дзякуй» не дадуць. Так, загінайце пальцы: ванначка (каштуе каля 250-400 тысяч), падстаўка для яе (каля 200 тысяч)...

**С.К.** — Ого, залатая падстаўка атрымліваецца. Можа, ты яе сам неяк зробіш? А не, не атрымаецца... Я ж забыў, што ты сталічны хлопец. Паехалі далей!

**У.К.** — Гэта мы пасля абмяркуем, рукасты вы наш. А далей ідзе «канверцік на выпіску» (350-700 тысяч), камплект пасцельнай бялізны (ад 900 тысяч да 1,5 мільёна). А яшчэ мы забыліся пра каляску — гэта яшчэ ад 1,5 да 15 мільёнаў (у залежнасці ад апетытаў). Але найлепшыя варыянты — ад 4 мільёнаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**С.К.** — І гэта мы пра вядомыя мужыку рэчы кажам. А колькі яшчэ ёсць розных дробязяў, якія маладой маме і дзіцяці патрэбны. Але добра, што ты хаця б пра гэта падумаў. Ведаю я адну сям'ю, якая за «дзіцячыя» набыла «плазму» на ўсю сцяну. Дзіўна яна так выглядала ў невялікім пакойчыку інтэрната...

**У.К.** — А цяпер давайце трошкі падлічым нашу будучую радасць. З бюджэту мы атрымаем прыкладна 11,5 мільёна. Плюс яшчэ 5-7 мільёнаў павінен адшукаць будучы тата. Агулам атрымліваецца ад 16,5 да 18,5 мільёна.

**С.К.** — Сімпатычная лічба, на мой погляд. Дзве тысячы долараў атрымліваецца...

**У.К.** — Гэта для вас дзве тысячы, а для маладой сям'і — рэчы першай неабходнасці. Калі ўзяць наш спіс па нармальным сярэднім цэнніку, «без прыбамбасаў», то атрымліваецца недзе 11 мільёнаў.

**С.К.** — Усміхаешся? Мабыць, укладваешся? Але мы не ўлічвалі непрадбачаныя выдаткі. Калі малога з радзільні забіраюць, то медперсаналу даюць торцікі, шампанскае, цукеркі. На такое свята жонцы шыкоўны букет ты што, не адшкадуеш? А з бальніцы дадому з малым — выключна на таксі. Там таксі, тут шампанскае і цукеркі, зноў таксі... Табе яшчэ гэтых грошай мала будзе.

## «Ты што, не чуеш, што я маўчу?»

**У.К.** — Фух, значыць, я ўжо падрыхтаваны. Дакладна ведаю, што трэба купіць, якой якасці і колькі мне гэта будзе каштаваць. Ну як — я здам экзамен на «маладога тату»?

**С.К.** — Не-а. Не ўсё ў сям'і можна падлічыць рублямі, цудоўнымі ложкамі або дарагімі каляскамі. Тут усё крыху складаней. Цяжарныя жанчыны такія ранімыя, нават трошкі недзе звар'яцелыя на сваім прызначэнні, калі нараджаюць упершыню. Мая, напрыклад, моцна крыўдзілася, калі я менш чым два разы на дзень запытваў яе пра тое, як там наш малы сябе паводзіць, калі забываўся казаць нейкія ласкавыя словы. Жонку раздражняла нават тое, што я часам глядзеў на яе не так. «А як трэба?», — пытаўся я. «Ты што, не разумееш? Глядзі на нас па-іншаму. Я ўжо не адна, нас двое», — адказвала мне жонка. А як мне было зразумець яе рэпліку: «Ты што, не чуеш, што я маўчу?» Да гэтага трэба ўжо зараз рыхтавацца. Іх варта не толькі разумець, але і самому пераключыцца на іншую хвалю. У свайго будучага малога неабходна ўкладваць не толькі нейкія фінансы. Тут трэба больш укладваць (не зусім гэта тое слова) сваёй любові і ўвагі, увогуле ўсяго сябе.

**У.К.** — Ах вось яно як... Атрымліваецца, што маёй прыгажуні неўзабаве будзе недастаткова толькі таго, што я яе моцна кахаю?

**С.К.** — У яблычак.

**P.S.** *Аўдыязапіс размовы вы можаце знайсці на zviazda.by.*

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Лепш папярэдзіць

# «ХАЧУ ЖЫЦЬ З МАМАЙ...»

Колькасць сацыяльных сірот і непаўналетніх правапарушальнікаў можна паменшыць

**Якімі б ні былі бацькі, дзеці іх любяць, ды і яны сваіх дзяцей таксама. Але сем'і бываюць розныя: шчаслівыя і не вельмі, уладкаваныя і не. А яшчэ сярод іх ёсць такія, што знаходзяцца ў стане няўстойлівай раўнавагі. Часам у іх справы ідуць лепш, часам — горш, і яны вельмі ўразлівыя перад знешнімі зменамі. Таму, напрыклад, страта працы або смерць кагосьці з бацькоў маментальна прыводзіць такую сям'ю да крызісу...**

## Даць шанц...

Як правіла, калі сям'я аказваецца ў складаным становішчы, а дзіця — у сацыяльна небяспечным, то з ім пачынаюць працаваць спецыялісты, у першую чаргу школа або дзіцячы сад. Калі ж становішча ў сям'і становіцца крытычным, падключаюцца сектар аховы дзяцінства, камісія па справах непаўналетніх. Дзіця прызнаецца маючым патрэбу ў абароне і трапляе ў прытулак тэрмінам да 6 месяцаў.

Але на нейкім этапе справы ў сям'і з шэрагу «няўстойлівых» могуць выправіцца — трэба толькі падтрымаць яе. Дык ці трэба адразу забіраць дзіця з такой сям'і? Ці, можа, лепш дапамагчы ёй у складаны перыяд, даць шанц захавацца і захаваць дзіця ў ёй?

**Дырэктар прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Беларусі Ірына МІРОНАВА** кажа: «Работа па Дэкрэце Прэзідэнта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўладкаваных сем'ях» у краіне мела некалькі этапаў. Спачатку спецыялісты працавалі з абсалютна відавочнымі выпадкамі, калі ніякага іншага выйсця, акрамя як забраць дзіця з сям'і, не заставалася. Па меры таго, як набіраўся вопыт, навучыліся выяўляць раннія праявы праблем, якія могуць прывесці да крызісу. Тут і паўстала пытанне: як прадухіліць пераход гэтых сямейных праблем у крызіс? Розныя формы работы па папярэджанні пераходу сям'і ў разрад крызісных шырока выкарыстоўваюцца ва ўсім свеце. Чаму б і нам не паспрабаваць правесці невялікі эксперымент і не паглядзець, як гэта спрацуе?

Так пры падтрымцы прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Рагачове, Смаргоні, Полацку ў рамках праекта «Групы дзённага знаходжання: водгук мясцовай супольнасці на абарону дзіцяці ад жорсткага абыходжання» былі створаны дзённыя групы для дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. У Жодзіне такая група была створана пры падтрымцы і пад эгідай Міністэрства адукацыі.

## «Ёсць рэальныя вынікі»

— Такія групы разлічаны на тое, каб не даводзіць напружаную сямейную сітуацыю да адабрання дзіцяці, — распавядае **дырэктар сацыяльна-педагагічнага цэнтра Полацкага раёна Анжэла ВАЛАСЕВІЧ.** — Цяпер у складанай сітуацыі мы бяром дзіця не ў кругласутачны прытулак, а ў групу — і працуем з ім, працуем з сям'ёй, стараемся выправіць становішча. Прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Беларусі прапанавала нам сваю падтрымку — фінансавую, метадычную, дапамагло навучыцца нашым спецыялістам.

Напрыклад, у нас у групе былі дзеці з сям'і, дзе мама проста не ўмела клапаціцца аб іх, таму што сама вырасла ў няўладкаванай сям'і і ў яе не было перад вачыма падобнага прыкладу, — кажа **галоўны спецыяліст сектара аховы дзяцінства аддзела адукацыі, спорту і турызму Полацкага райвыканкама Тамара ЛЮЦЬКО.** — Дзеці былі бескантрольнымі, сама маці перабівалася выпадковымі заробкамі. Дзякуючы гэтай праграме мы дапамаглі дзецям — яны былі пад наглядам педагогаў і псіхолагаў, харчаваліся ў дзённай групе, а таксама іх маме — з працаўладкаваннем, з рамонтам у доме. А калі б не гэтая падтрымка, дзяцей забралі б з сям'і.

Тамара Люцько перакананa, што трэба працягваць пачатую працу: «Такім чынам эканомяцца дзяржаўныя сродкі, бо ўтрыманне дзіцяці ў прытулку абыходзіцца досыць дорага (у 5 разоў даражэй, чым групы дзённага знаходжання). А тут дзіця прыходзіць да нас пасля ўрокаў, мы дапамагаем яму зрабіць хатнія заданні, кормім, арганізоўваем яго вольны час — водзім у кіно, музеі, на розныя мерапрыемствы... Чымсьці гэта нагадвае групы падоўжанага дня, якія практыкуюцца ў нас яшчэ з савецкіх часоў, толькі мы яшчэ праводзім рэабілітацыйную працу з сям'ёй. А ўвечары дзіця адпраўляецца дадому»...

Дзеці сюды трапляюць складаныя. Яны прывыклі да таго, што ўсе на іх злуюцца, і ўжо выпрацавалі ахоўную рэакцыю. Над тым, каб яны раскрыліся, трэба папрацаваць. Таму вельмі многае залежыць ад спецыялістаў — псіхолагаў, выхавальнікаў. «Але ўжо ёсць рэальныя вынікі, нягледзячы на тое, што працуем усяго паўгода (дзённае аддзяленне пры прытулку адкрылася ў Полацку сёлета), — кажа Анжэла Валасевіч. — Тыя дзеці, у каго ўжо скончылася рэабілітацыя і якія ўжо не наведваюць групу, усё роўна заходзяць сюды ў госці».

## «Калі б гэта ўзаконіць!..»

У Рагачове такую групу адкрылі ў школе № 4, якая размешчана ў аддаленым мікрараёне і ў якой навучаецца шмат дзяцей з няпоўных, шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў.

— У групе было 15 чалавек, вучні 5—9 класаў, — кажа **дырэктар школы Аляксандр Лейкін.** — З іх пяцёра знаходзіліся на ўнутрышкольным кантролі як схільныя да здзяйснення правапарушэнняў, двое — на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх за ўжо здзейсненыя злачынствы (атрымалі пакаранне з адтэрміноўкай). Праблемы былі і ў іх сем'ях. І сітуацыя дома, і вуліца толькі ўзмацнялі асацыяльныя паводзіны гэтых дзяцей. Але мы змаглі адарваць іх ад вуліцы. Вядома, гэта было нялёгка. Упор мы зрабілі на цікавыя заняткі ў вольны час. Для гэтага ў нас ёсць камп'ютары, вялікі тэлевізар, спартзала, трэнажорная зала, працуе псіхолаг, сацыяльны педагог. Выхавальнікам стаў малады чалавек, які нядаўна скончыў універсітэт і лёгка знайшоў агульную мову з гэтымі хлопцамі, фактычна стаў іх старэйшым сябрам, лідарам. Задаволены і бацькі — бо іх дзяцей дадаткова два разы кормяць, прычым бясплатна, дапамагаюць рыхтаваць хатнія заданні.

У школе ўжо з'явіліся дзеці, якія хацелі б далучыцца да нашых падлеткаў, але мы не можам іх узяць: больш за 15 чалавек у групе мець непажадана — тут трэба гнацца не за колькасцю, а за якасцю працы.

У Рагачове таксама не збіраюцца заканчваць гэты праект. Бо пазітыўныя вынікі ў наяўнасці. «За паўгода працы групы ніхто з дзяцей не здзейсніў ніводнага правапарушэння, — дзеліцца **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Рагачоўскага райвыканкама Пётр ГУЗЯЛЕВІЧ.** — Стабілізавалася абстаноўка ў школе, бо гэтыя хлопцы раней былі адмоўнымі лідарамі. У трох сем'ях нашых выхаванцаў палепшылася сямейная сітуацыя. Да таго ж, па вялікім рахунку, на ўтрыманне падобнай групы не патрэбны вялікія фінансавыя выдаткі. У любым выпадку яны несувымяральныя з вынікам — бо мы дапамагаем гэтым дзецям стаць нармальнымі членамі грамадства».

Цяпер у 4-й школе Рагачова з гэтымі «цяжкімі» падлеткамі няма ніякіх праблем. І гэта дадае аптымізму. «Калі б толькі гэтая форма працы яшчэ была ўзаконена нарматыўна...» — гавораць спецыялісты і збіраюцца ўнесці такую прапанову ў Міністэрства адукацыі.

**Святлана БУСЬКО**

■



■ Дзённік настаўніка

# Ці абрынецца неба?..

**Памятаю, як у школу на змену звычайнай пяцібальнай сістэме прыйшла дзесяцібальная. І памятаю, як тлумачылі тады і настаўнікам, і бацькам вучняў неабходнасць увядзення гэтай новай сістэмы, яе асаблівасці і, галоўнае, кардынальныя яе адрозненні ад папярэдняй.**

І самым адметным адрозненнем з'яўлялася не тое нават, што зараз можна будзе больш справядліва выстаўляць вучням адзнакі. Адрозніваўся сам прынцып выстаўлення адзнак, якія ўсе (паўтараю, усе!) з'яўляліся станоўчымі. Адмоўным быў толькі нуль, які ў гэтую самую дзесяцібальную сістэму нават не ўваходзіў. Ведаеш на адзінку — атрымай менавіта адзінку, і з гэтай адзінкай можаш паспяхова з класа ў клас пераходзіць. Паступіш ты з ёю куды ці не паступіш — гэта ўжо іншае пытанне, але школу ўсё роўна закончыш, і на другі год цябе ніхто пакідаць не збіраецца, нават калі ў цябе, акрамя адзінак і двоек, іншых адзнак і не будзе ў пасведчанні аб базавай адукацыі...

Не ведаю, як іншым, а мне гэты новы падыход нават спадабаўся. Спачатку. А потым...

Неяк вельмі хутка пасля ўвядзення «дзесяцібалкі», адзінка і двойка зноўку ператварыліся ў адзнакі адназначна адмоўныя. І настаўніку, перш чым іх выстаўляць (тым больш за чвэрць ці за год), трэба было добра падумаць. Ну, паставіць ён іх вучню (заслужана, між іншым!) і што? Вучня ён гэтым пакарае?

Ды сябе самога ў першую чаргу! І родную школу — у другую!

Бо адразу ж і самога настаўніка, і школу на асабісты кантроль паставяць, правяраючыя абавязкова наведаюцца. Як так, чаму недапрацавалі? Колькі з гэтым вучнем дадатковых заняткаў правялі?

І як растлумачыць тым кантралёрам, што вучань гэты і на адзінку нічога не ведае, ды і ведаць нічога не жадае, хоць кожны дзень з ім дадаткова займайся. І ці не лепш гэтыя дадатковыя заняткі праводзіць з тымі, хто сам імкнецца палепшыць якасць сваіх ведаў і тым самым павысіць балы, якія за гэтыя веды атрымлівае...

— А вы і з тымі займайцеся, хто ж супраць? — адкажуць правяраючыя. — Але ж з гэтым, які двойку за год атрымаў, трэба было больш займацца! І менавіта з ім у першую чаргу!

І ра-аз — вымову! За недапрацоўку.

Падумае настаўнік, паразважае цвяроза і ў наступны раз ніжэй за тройку за год нікому выстаўляць ужо не рызыкне. А вучань, добра ўсвядоміўшы, што, як бы ён ні лайдачыў, а троечку потым усё роўна атрымае, наогул перастае хоць што-небудзь вучыць...

Але гэта толькі адзін бок праблемы. Бо калі таму, хто нічога не ведае і на ўроках наогул нічога не адказвае, «ліпавыя» тройкі ні за што ставяцца, то сапраўднаму троечніку менш за чацвёрку і выстаўляць ужо неяк няёмка. І нават пяцёрку можна час ад часу вывесці, бо нейкія ж веды ён усё ж паказвае на ўроку...

І пайшло-паехала! Таму, хто ведае на цвёрдую пяцёрку (калі ўсё строга па крытэрыях дзесяцібальнай сістэмы вырашаць), трэба ўжо шэсць-сем выстаўляць, не менш... А то і ўсе восем!

Шкада мне менавіта гэтых дзяцей, калі шчыра. А іх бацькоў яшчэ больш шкада. Бо якім жа расчараваннем становіцца для іх потым цэнтралізаванае тэсціраванне, калі са ста магчымых балаў гэтыя «васьмёрачнікі» з цяжкасцю набіраюць балаў дзесяць. А то і тых не дабіраюць...

— Як жа так? — запознена абураюцца бацькі. — Мой сын у школе ўсё ж такі няблага вучыўся: адны сямёркі ды васьмёркі ў атэстаце! Значыцца, штосьці з гэтымі тэстамі няправільнае! Складаныя яны вельмі для выпускнікоў, спрашчаць іх трэба!

Тэсты і сапраўды складаныя, з гэтым я не буду спрачацца. Ды ўсё ж не настолькі, каб, скончыўшы школу з сямёркамі і васьмёркамі, не набраць на тэсціраванні хаця б 50 балаў са 100. Але гэта ў тым толькі выпадку, калі сямёркі ды васьмёркі заслужаныя...

Зразумейце мяне правільна! Я, у адрозненне ад некаторых маіх калег-педагогаў, не лічу, што ўвядзенне дзесяцібальнай сістэмы было памылковым рашэннем. Тым больш не заклікаю неадкладна вярнуцца да такой звыклай пяцібальнай адзнакавай шкалы.

Я толькі хачу, каб дзесяцібальнай сістэме вярнулі яе першапачатковае значэнне. І каб настаўнікі не баяліся выстаўляць адзінкі ды двойкі тым, хто ведае іх прадмет менавіта на гэтым узроўні. І нават нулі не баяліся выстаўляць вучням, якія наогул нічога вучыць не жадаюць.

Згодны, пасля гэтага паказчык сярэдняй паспяховасці ў школах (ды і ў раёнах у цэлым) крыху знізіцца. І нават не крыху, а даволі значна. І што? Неба абрынецца на зямлю?

Хіба не для таго ўводзілася і дзесяцібальная сістэма, і цэнтралізаванае тэсціраванне, каб не адзнакі былі галоўным крытэрыем навучання, а веды?

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

■

■ Праз сябе

# Там — убогія клумбы дзяцей

**Дзеці — гэта кветкі жыцця. А жыццё... Яно — таварыш пераборлівы: адны кветкі пахнуць у шыкоўных кватэрах, іншыя адчайна ловяць сонечны промень на сметніцы. Дзеці — гэта кветкі жыцця. Міф? А можа, не міф наогул? Ведаеце, хіба ўсё ж такі міф. Калі дзеці — сапраўды кветкі жыцця, то чаму ім часта жывецца так, як пустазеллю, і нават горш?**

На пытанне «Чаму ўкрала?» Каця, чатырнаццаці гадоў, адказвае па-філасофску: «У іншых ёсць мабільнік, а ў мяне? Дзе справядлівасць?» І праўда: дзе?

«А ў іх толькі адзін аргумент. Маўляў, чаго ж ты зімою лёду шкадуеш? Не збяднееш, калі падзелішся. Паверце, так разважаюць абсалютна ўсе», — запэўнівае Павел Салабуда. Ён, галоўны псіхолаг гродзенскай турмы, спыняецца ў прахадным пакоі. Невясёлы зялёны колер сцен, як трава, якая ўжо не лета, яшчэ не восень, і маштабная дошка з раскладам дня: тут пад'ём у 6, адбой — у 10. Металічныя дзверы цягнуцца бясконцым радам — дарога ў нікуды.

Калі адчынілі камеру, з якой павезлі Кацю на суд, кінулася ў вочы маленькая прарэзаная дзірачка, якая называецца акном. Тоўстыя металічныя палкі — тры ці чатыры — чорнымі зубцамі прайшліся ўздоўж, каб сапсаваць галоўнае. Тое, што скрозь іх. Металічныя палкі перашкаджалі ўзвышацца бялюткаму лісту паперы, якое называецца небам. І два куткі: левы — прытулак для першага ложка, правы — для другога. Своеасаблівае «тэт-а-тэт», якое парушае ўмывальнік, сметніца і ўнітаз. Адзінае жывое — звычайны хлеб, які чыясьці рука разрэзала на дзве лустачкі. Разрэзала няроўна. І вось так ад хлеба крошкі разышліся паўкругам. Разышліся паўмесяцам. Не, лепш — паўсонцам, якое сюды хочацца прынесці невымоўна.

І ты стаіш вось так. Унурыўшы галаву, паводзячы нібы ад холаду плячыма, толькі і застаецца хадзіць з кута ў кут. І наглядчык у тваім разуменні звер, які ўсё ўзіраецца ў цябе вялікімі шклянымі вачыма, нерашуча перамінаецца з нагі на нагу. Гэта яго работа.

І сядзіць такое дзіця, як жучок, на купіне сярод велізарнай лужыны. І думае. Не, сур'ёзна. Дзіця проста не можа не думаць: «Не век жа мне сядзець склаўшы рукі — трэба ж даваць рады. Трэба ж знайсці агульную мову са светам! Знайсці, хоць і не пад сонцам, а ўсё ж такі месца сваё, уласнае». Жыццё праляціць у адно імгненне. І ўжо тысячы пажылых Кацяў, шчаслівых і нешчаслівых, скажуць камусьці: «Дзетачкі, а я ж так і не жыла. Як на свінні праехала». Ці думаюць дзеці пра гэта?

Ведаем, колькі хвілін таму яна, Каця, пасля таго як яе выгналі з дому, яшчэ стаяла вось тут. На гэтым месцы, пра якое не маем уяўлення мы, шчаслівыя, залюбленыя часта сляпым бацькоўскім сэрцам. Мы, апранутыя, абутыя, накормленыя — не, не проста апранутыя, і абутыя, і накормленыя — стыльна, дорага апранутыя і абутыя, смачна накормленыя. Мы — доўгачаканыя. Зусім іншай пароды кветкі. Дагледжаныя. На падкормкі для нас грошай не шкадуюць. Своечасова паліваюць. Раз на тыдзень — абавязковы душ. Пакаёвая тэмпература і толькі. І хоць часам тата можа сказаць маме: «Хопіць з дзіцем няньчыцца! Што ты яго цяплічным робіш? Дзе самастойнасць?» Гэта бывае часам, заўжды — амаль несур'ёзна. Гэта як на ўсе патрабаванні адзін жартаўлівы адказ: «Можа, табе і ключы ад кватэры, дзе грошы ляжаць?» Вядома, тата па асабліваму схільны песціць дачку. І з дна мора, і з-пад зямлі дастане падарунак: любімай кветачцы будзе прыемна.

У Каці таты не было. Каця — дзіця з нешчаслівай сям'і. Не раз і не два маленькай дзяўчынцы давозілася ноччу выбягаць з кватэры. Часта зімой, калі мароз і снег. Маці любіла жыццё напоўніцу. А каб штонішто мець, не зводзіць канцы з канцамі, яна не хацела варушыць мазгамі і працаваць да поту і мазалёў крывавых. Не, лепш піць і гуляць, гуляць і піць. І Каця, абдзеленая цеплынёй, пацягнулася да тэлефонаў. Можа, і сапраўды маюць рацыю, калі кажуць: «Ад асінкі не нарodзіцца апельсінка». Зачараванае кола пакацілася і набірала абароты. Выкрала першы раз — злавілі, другі — злавілі. Абяцала з ходу змяніцца. Маўляў, больш не буду. Але з ходу бывае выключна ў казках. На трэці раз дайшло да суда. Калі шчыра, крадзежамі не абмежавалася. Каця, маладзенькая і прыгожая, амаль дзіця, да сваіх пятнаццаці развіталася з усім, з чым толькі можна было развітацца.

Яна, нібыта цягнік, пранясецца па жыцці праз лясы і балоты. Неймаверна далёка ад людзей пранясецца, як вецер, зацягваючы пакрыўджаны жалезны крык, патрабуючы «зялёнай вуліцы». А потым яна, ужо не патрабуючы, не шкадуе, не кліча, не плача. Ёй усё роўна. Першы чырвоны ліхтар загараецца на дарозе чатырнаццацігадовай Каці. Каці, за плячыма якой не знойдзеш бесклапотны перыяд з пухнатымі мядзведзікамі і лялькамі ў ружовых сукеначках. Першы «чырвоны» абяцае зацягнуцца даўжынёй у адно жыццё. Яе жыццё.

Абгарэлыя каструлі, брудныя смярдзючыя анучы, пакецікі самай таннай гарбаты, залітая чымсьці карычневым газавая пліта, «табуны» тараканаў; счарнелы чайнік надрываецца свістком — гэта пяць метраў пракуранай кухні. Адзіная маёмасць не раз асуджанай Каці. Гродзенская хрушчоўка. Прабачце, «хрушчоба», калі больш дакладна.

І Каця, ужо не маладая і ўжо не прыгожая, кацяня-пераростак, якое не знойдзе, на чыіх каленях памурлыкаць. А колькі было гэтых каленяў!.. Каленяў непрыстойных маладых людзей і не менш непрыстойных старых. Але каб не піў, не курыў, не біў, каб не гультай, не бомж, не дурань — так не было ніколі.

**Маргарыта СІДАР**

■

■ Напагатоў

# ПЕРШЫ СНЕГАПАД ПЕРАЖЫЛІ. ДАЛЕЙ — ЛЯГЧЭЙ?

**Год таму цыклон «Хаўер» фактычна на цэлы вечар паралізаваў беларускія гарады і прынёс шмат праблем іх жыхарам. На прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы супрацоўнікі камунальных службаў паабяцалі не паўтараць ранейшых памылак і папрасілі актыўнай дапамогі і разумення з боку саміх гараджан.**

Для пасыпкі дарог камунальнікамі нарыхтавана пясчана-саляная сумесь, а таксама чыстая соль. Нягледзячы на шматлікія скаргі гараджан, гарадскія службы пакуль не спяшаюцца праводзіць эксперыменты з іншымі рэагентамі ў барацьбе са снегам і лёдам. Галоўная праблема ў тым, што сумесь, якую выкарыстоўваюць цяпер, выйграе сярод астатніх па галоўным паказчыку — сабекошце. Нават соль, апрацаваная простымі антыкаразійнымі дабаўкамі, каштуе ў два разы больш за звычайную. Аднак, па словах галоўнага інжынера ДВА «Гаррэмаўтадар Мінгарвыканкама» Аляксандра ЯРОШЫКА, ужо зараз прапрацоўваюцца варыянты сумесяў на аснове меласы — пабочнага прадукту вытворчасці цукру. «Трэба спачатку пралічыць, а толькі потым нешта рабіць, — лічыць Аляксандр Ярошык, — бо мы прыбіраем снег за грошы падаткаплацельшчыкаў і не можам не ўлічваць фінансавыя ўмовы апошніх».

Адна з важнейшых праблем падчас прыбірання вуліц ад снегу — прыпаркаваныя на праезнай частцы аўтамабілі. Па словах спадара Ярошыка, гэтая праблема ў Беларусі толькі з'явілася і пакуль што мала адчуваецца ў параўнанні з вялікімі мегаполісамі. Але яе трэба вырашаць, каб у будучым не сутыкнуцца з аналагічнай навалай. «Мы заўжды загадзя папярэджваем аўтамабілістаў аб датах прыбірання пэўных вуліц праз інтэрнэт і СМІ, — кажа Аляксандр Ярошык, — але людзі звычайна ігнаруюць гэтыя заклікі. Прыходзіцца выклікаць эвакуатары, і замест чатырох гадзін на прыбіранне вуліцы ідзе ўся ноч. Лёгка казаць, што камунальнікі не спраўляюцца, калі сам не выконваеш свае абавязкі».

За апошнія два гады ў сталіцы было закуплена 330 новых адзінак снегапрыбіральнай тэхнікі. Дагэтуль такім маштабных абнаўленняў не было. Недахоп вулічных прыбіральшчыкаў таксама ліквідуюць за кошт новай невялікай тэхнікі (пыласосаў і г.д.), якая замяняе некалькі дзясяткаў традыцыйных работнікаў. Для хуткага рэагавання і ўзаемадзеяння паміж рознымі службамі ва ўмовах анамальнага надвор'я (моцныя снегапады, хуткае паніжэнне тэмпературы паветра) быў распрацаваны аператыўны план «Завея».

Таксама камунальнікі папрасілі аўтамабілістаў быць акуратнымі і падчас вялікіх снегападаў устрымлівацца ад паездак на машыне без вялікай на тое патрэбы. «Падчас цыклону «Хаўер» галоўная праблема была ў тым, што ўсе дарожнікі стаялі ў заторы разам з аўтамабілістамі», — сказаў Аляксандр Ярошык. — Самай вялікай цяжкасцю для нас заўжды становіцца першы снегапад, але яго мы перажылі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■

Краіна здароўя

Выпуск № 10 (311)

■ Чытачы цікавяцца

# ЯК ПРАВІЛЬНА ЎЖЫВАЦЬ ЧАЙ І КАВУ?

**Чай папулярны ва ўсім свеце. Хімічны састаў чаю ўсё яшчэ не вывучаны да канца. Тым не менш нават тых звестак, што ёсць, дастаткова, каб зрабіць выснову: гэта карысны напой. Ён змяшчае практычна ўсе вітаміны ($B_1$, $B_2$, P, PP), карысныя мінеральныя рэчывы, што дазваляе не толькі прафілактаваць авітаміноз, але і выкарыстоўваць гэты напой падчас разгрузачных дзён без пазбаўлення арганізма неабходных рэчываў.**



Багаты чай і на поліфенолы (антыаксіданты, якія дазваляюць ачышчаць арганізм, выводзячы таксіны), дубільныя рэчывы (нармалізуюць работу кішэчніка), пекціны і клятчатку (прафілактуюць жоўцекаменную хваробу і атэрасклероз), змяшчае цынк (хоць і ў невялікай колькасці), марганец, які спрыяе нармальнай рабоце нервовай сістэмы і апорна-рухальнага апарату. Пяць кубкаў напою забяспечваюць палову сутачнай патрэбы арганізма ў марганцы.

У склад чаю ўваходзіць і кафеін, які паляпшае кровазварот, актывізуе работу галаўнога мозга, здымае стомленасць і пазбаўляе санлівасці. Менавіта таму карысна піць чай раніцай.

Калі мы кажам пра карысць чаю, то маем на ўвазе свежагатаваны напой. У чайных пакеціках змяшчаецца толькі чайны пыл, а ў халодным чаі, які прадаюць у магазіне, ёсць толькі хімічныя дабаўкі, якія паляпшаюць смак.

Каб сапраўды атрымаць карысць, не варта дадаваць у напой цукар, варэнне, малако. Рэкамендуецца абмяжоўвацца пяццю кубкамі ў дзень.

Кожны любіць піць чай па-свойму. Нехта бярэ менш і гатуе даўжэй, а нехта кладзе шмат і гатуе вельмі хутка. Тут трэба ведаць, што ёсць чай лёгкі, які не тое што можна, але і трэба класці пабольш у чайнік. У асноўным гэта ўлуны, якія вельмі хутка аддаюць свой смак і не вытрымліваюць шматразовага дадавання кіпеню.

Што да колькасці чаепіццяў у дзень, то тут варта арыентавацца на ўласныя адчуванні, сачыць за сваім здароўем. Калі вы выпіваеце 6 кубкаў у дзень і не можаце заснуць, то, вядома, трэба піць менш. А калі такая колькасць не перашкаджае вашаму самаадчуванню, то можна і не абмяжоўваць.



У Кітаі, асабліва ў тых правінцыях, дзе знаходзіцца вытворчасць чаю, ужываюць вельмі многа гэтага напою. Адзінае, што можна рэкамендаваць, — не ўжываць чай на галодны страўнік.

На тэму карысці і шкоды кавы дагэтуль спрачаюцца гурманы кавы, урачы, вучоныя і г.д. Самае важнае ў гэтым сэнсе — таксама пачуццё меры. Калі вы выпіваеце не больш за 2 маленькія кубачкі кавы ў дзень, то пра шкоду няма што і казаць. Яе няма. Іншая рэч, ёсць некаторыя захворванні, пры якіх урачы не рэкамендуюць гэты напой наогул (любыя парушэнні сардэчнага рытму, ішэмічная хвароба сэрца, атэрасклероз, гіпертанія, захворванне нырак, язва страўніка або дванаццаціперснай кішкі, іншыя хваробы страўнікава-кішачнага тракта, глаўкома, бяссонніца, павышаная ўзбуджальнасць, цяжарнасць і інш.). Істотна абмяжоўваць ці проста выдаляць каву з рацыёну рэкамендуецца людзям сталага веку.

Лепш за ўсё піць каву пасля ўжывання ежы — добрага сняданку, і ні ў якім разе не нашча. Пажадана толькі ў першай палове дня, інакш арганізму складаней будзе рыхтавацца да сну, хоць тыя, каму да 35 гадоў, могуць гэтага асабліва і не адчуваць.

Пры гіпертаніі варта абмежаваць ужыванне кавы да аднаго кубка ў дзень з правільным яго ўжываннем і агаворкай на самаадчуванне. Аднак у такім выпадку можна было б і выдаліць каву са свайго рацыёну.

Пры гіпатаніі, наадварот, не пашкодзяць 3 кубачкі ў дзень. Аднак перагібаць палку ўсё роўна не варта.

Калі вы рэгулярна выпіваеце некалькі кубкаў кавы ў дзень, то эфект бадзёрасці з цягам часу становіцца менш адчувальным. Арганізм проста прывыкае, але гэта не азначае, што неабходна павялічыць аб'ёмы напою. Проста дайце сабе перапынак — хоць бы на некалькі тыдняў. Калі вы будзеце мець на ўвазе ўсё пералічанае, то кава стане вашым сябрам: дапаможа зняць стомленасць, павысіць працаздольнасць, палепшыць кровазварот, актывізаваць разумовую дзейнасць. Да адмоўных вартасцяў кавы адносіцца тое, што напой здольны павялічваць халестэрын крыві (з-за чаго рэкамендуецца карыстацца кававаркай з фільтрам), павышаць крывяны ціск, выклікаць прывыканне.

Няма нічога складанага ў тым, каб замяніць каву на цыкорый, які ў нечым падобны на каву, але не мае пабочных эфектаў і нават нейтралізуе шкоднае ўздзеянне кавы.

Што да растваральнай кавы, то тут самым важным «плюсам» застаецца адзін: хуткасць гатавання. Ніякай карысці шукаць у такім напоі не варта.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ На раёне

# ЗНОЎ НАВУЧЫЦЦА ХАДЗІЦЬ

## Якую медыцынскую рэабілітацыю ажыццяўляюць у Атоліне?

**Вось ужо год на базе Атолінскай бальніцы Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы функцыянуе цэнтр медыцынскай рэабілітацыі для пацыентаў з паталогіямі, якія найчасцей прыводзяць да інваліднасці. Будынак Атолінскай бальніцы — 1968 года нараджэння. Многія ведаюць, што ў савецкі час тут, у ляску, каля рэчкі, размяшчаўся ўтульны кампактны пансіянат для «цэкоўскіх» работнікаў. Лес з ракой засталіся, а вось будынак перажыў рамонт і пераасншчэнне. У трохпавярховым будынку ўсталявалі нават ліфт — з улікам стану пацыентаў, якія накіроўваюцца сюды на рэабілітацыю з захворваннямі неўралагічнага, артапеда-траўматалагічнага і анкалагічнага профілю.**



Падчас агляду ў артапеда-траўматалагічным аддзяленні.

120 ложкаў, вылучаных на гэтыя мэты, запоўнены стапрацэнтна. І не толькі таму, што размова ідзе пра досыць цяжкія паталогіі, для перамагання якіх патрабуюцца не толькі таблеткі, але і таму, што, у адрозненне ад гарадскіх жыхароў, сельскія не заўсёды могуць прайсці курс медыцынскай рэабілітацыі ў амбулаторных умовах.

— У Атолінскі цэнтр рэабілітацыі накіроўваюць пацыентаў з усёй Мінскай вобласці, — тлумачыць **галоўны спецыяліст аддзела лячэбна-прафілактычнай дапамогі ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама Леаніда ВЫСОЦКАЯ**. — Ёсць у вобласці і міжраённыя аддзяленні рэабілітацыі — на базе Чысцінскай участковай і Гарадзейскай гарадской бальніц. Налета плануем адкрыць яшчэ такое ж аддзяленне ў Старобінскай гарадской бальніцы. Зразумела, існуюць паказанні, па якіх хворыя накіроўваюцца на рэабілітацыю ў адпаведныя ўстановы рэспубліканскага прызначэння. Аднак сёння ў Атоліне створаны вельмі добрыя ўмовы, і шэраг пацыентаў можа атрымліваць такую дапамогу менавіта тут. Толькі на даасншчэнне спецыяльнай апаратурай з бюджэту было выдаткавана каля 3,5 млрд рублёў. Паводле заўваг саміх пацыентаў, не хапае, хіба, водных працэдур — бальнеалячэння. Але гэта немагчыма з аб'ектыўных прычын...

Рэабілітацыя сёння ажыццяўляецца паводле комплекснага падыходу мультыдысцыплінарнай брыгадай — з удзелам урача-рэабілітолага, фізіятэрапеўта, рэфлексатэрапеўта, інстуктара-метадыста фізічнай рэабілітацыі, лагапеда, масажыста. Для кожнага пацыента складаецца свая праграма медыцынскай рэабілітацыі пасля перанесенага захворвання, якая ўключае псіхалагічныя, фізічныя, рэфлекторныя, медыкаментозныя метады, бытавую адаптацыю і г.д. Ёсць сітуацыі, калі хвораму патрабуюцца паўторныя курсы.

— У неўралогіі дастаткова паталогій, пры якіх патрэбна рэабілітацыя ў той ці іншай ступені — для хворых з хранічнымі радыкулітамі, наступствамі перанесеных чэрапна-мазгавых траўмаў, полінейрапатыяй, запаленнямі нерва твару або трайнічнага нерва, — кажа **загадчык неўралагічнага аддзялення рэабілітацыі Святаслаў КОЗЕЛ**. — Асобная група — пацыенты пасля перанесенага інсульту. Не існуе, па вялікім рахунку, паняцця «мікраінсульт». У любым выпадку мы маем справу з сур'ёзнай, цяжкай хранічнай паталогіяй, схільнай да рэцыдываў. Такія пацыенты павінны пастаянна працаваць над тым, каб зменшыць праявы захворвання і прадухіліць рэцыдыў. Некаму для гэтага спатрэбіцца адзін курс медыцынскай рэабілітацыі ў год, другому — больш. Усё залежыць ад ступені неўралагічных дэфіцытаў, якія робяць чалавека інвалідам, — наколькі праяўляюцца нерухомасць канечнасцяў, парушэнне маўлення. Наша задача — максімальна аднавіць і захаваць здольнасць да самаабслугоўвання, не дапусціць інвалідызацыі, асабліва ў працаздольным узросце. Дапамагаюць нам не столькі медыкаментозныя метады лячэння, колькі лячэбная фізкультура, механатэрапія, фізіятэрапія, заняткі з лагапедам, спецыялістам па эрготэрапіі...

За 9 месяцаў гэтага года з 450 пацыентаў неўралагічнага аддзялення 60 былі выпісаны з выздараўленнем, 163 — з паляпшэннем на адзін функцыянальны клас (скажам, чалавек быў ляжачы, а пачаў садзіцца ці стаяць каля ложка). Такога, каб не было ніякіх станоўчых змен, фактычна не назіраецца. Вельмі многае залежыць ад самога пацыента. Рэабілітацыйны патэнцыял залежыць ад узросту, індывідуальных асаблівасцяў, спадарожных захворванняў.

Вельмі адрозніваецца медыцынская рэабілітацыя пацыентаў артапеда-траўматалагічнага профілю. У адных выпадках дапамога аказваецца так званым спінальным хворым — з траўмамі пазваночніка і спіннога мозга, у другіх — пацыентам, якія перанеслі хірургічнае ўмяшанне па замене каленнага або тазасцегнавога сустава. Першым неабходна, галоўным чынам, псіхалагічная дапамога. Пакуль гэтую функцыю выконваюць фактычна ўсе ўрачы цэнтра. Пацыентам пасля эндапратэзавання таксама неабходна псіхалагічная падтрымка, але адной яе яўна недастаткова. Выкарыстоўваюцца разнастайныя фізічныя метады рэабілітацыі, здольныя паўплываць на прыжыванне штучнага сустава і прывыканне пацыента да яго.

— У выніку замены сустава — каленнага, тазасцегнавога — рух у канечнасці ў любым выпадку парушаецца, — расказвае **загадчык артапеда-траўматалагічнага аддзялення Анатоль МАНЬКО**. — Неабходна адаптавацца да іншароднага цела. Гэтаму спрыяюць заняткі з прафесійным інструктарам па лячэбнай фізкультуры. З фізічных метадаў такім пацыентам паказана магніта-, лазера-, механатэрапія. Медыкаментознае лячэнне заклікана палепшыць кровазварот, зняць ацёк, боль, мышачнае напружанне, паскорыць працэс прыжывання. У ідэале неабходна аднавіць рух на сто працэнтаў, аднак тут многае залежыць і ад таго, наколькі паспяхова прайшла сама аперацыя. Першыя тры месяцы мы не рэкамендуем вельмі нагружаць сустаў, не знаходзіцца працягла ў становішчы стоячы...

Вользе Мікалаеўне з Дзяржынска — 57 гадоў, але яна нядаўна перанесла аперацыю па замене сустава. З абласной бальніцы пацыентку накіравалі сюды, у Атоліна. «Адчуваю сябе добра, хаджу на працэдуры, — кажа Вольга Мікалаеўна. — Думаю, па завяршэнні рэабілітацыі — праз 20 дзён — будзе значнае паляпшэнне».

Найчасцей, вядома, артапедычныя аперацыі пераносяць людзі сталага веку. Часам і адзінокія. Пра такіх пры выпісцы медустанова паведамляе ў лячэбную амбулаторыю па месцы жыхарства, а там — і сацыяльным службам.

— Усім анкахворым патрэбна рэабілітацыя, але абсалютнай большасці — псіхалагічная, якую можна атрымаць і амбулаторна, — тлумачыць **загадчыца аддзялення хіміятэрапіі і рэабілітацыі анкалагічных пацыентаў Вольга ШАХ**. — Спецыяльная рэабілітацыя неабходна пацыентам, якія перанеслі радыкальнае лячэнне — хірургічнае, прамянёвую тэрапію і хіміятэрапію з прычыны пухлін малочнай залозы, органаў малога тазу. У такіх выпадках развіваецца лімфадэма, якая знешне праяўляецца надзвычайнай ацёчнасцю верхніх або ніжніх канечнасцяў — у залежнасці ад лакалізацыі пухліны. У народзе такую ацёчнасць празвалі «слановасцю». Для змяншэння гэтых праяў выконваецца пнеўмакампрэсія, падчас якой праз спецыяльныя манжэты падаецца паветраная хваля ціску, і такім чынам аднаўляецца недахоп лімфадрэнажнай функцыі канечнасцяў. Як правіла, курс працэдур неабходна паўтараць двойчы на год. Гэта служыць адначасова і прафілактыкай лімфасаркомы, якая можа развівацца ў канечнасцях, схільных да ўтварэння лімфадэмы...

Галіна Мікалаеўна з Заслаўя кажа, што летась перанесла мастэктамію. Пасля таго рука, што была бліжэй да месца пухліны, пачала вельмі ацякаць, так што цяжка станавілася нават падабраць адзенне. Вось ужо другі раз Галіна Мікалаеўна прыязджае ў Атоліна на рэабілітацыю, якая вяртае ёй больш камфортнае самаадчуванне.

«У нас пакуль толькі адзін апарат пнеўмакампрэсіі, — удакладняе **загадчык філіяла №1 «Атолінская бальніца Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы» Мікалай ГРЫШУК**. — Аднак мы разлічваем, што ў наступным годзе ўдасца набыць яшчэ два такія апараты. У цэнтры ёсць усё неабходнае для аказання медыцынскай рэабілітацыі ў поўным аб'ёме па трох нашых профілях. Тым не менш штогод матэрыяльная база будзе папаўняцца. Спецыялістамі цэнтр практычна укамплектаваны, але застаюцца вакантнымі некаторыя пасады. Будзем рады прыняць на працу псіхолага, псіхатэрапеўта, масажыстаў».

Лячэбная фізкультура.



**Святлана БАРЫСЕНКА.**
**Фота Надзеі БУЖАН**

# АРТРЫТАЎ СТАНОВІЦЦА ТОЛЬКІ БОЛЬШ

**Вядома звыш сотні хвароб косна-мышачнай сістэмы. Аднак найбольшую распаўсюджанасць і найбольшы ўнёсак у часовую непрацаздольнасць забяспечваюць астэаартроз, астэапароз, рэўматоідны артрыт, падагра, спондылаартрыты. Рэўматычныя захворванні значна парушаюць якасць жыцця хворага. Фізічны, псіхалагічны, эмацыянальны і сацыяльны дабрабыт чалавека ў такім выпадку істотна мяняецца.**

У апошняе дзесяцігоддзе ва ўсім свеце адзначаецца яскравая тэндэнцыя да росту колькасці захворванняў косна-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, прычым тэмпы росту апярэджваюць рост агульнай захваральнасці (усе класы захворванняў), — адзначае **галоўны пазаштатны рэўматолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Наталля МАРТУСЕВІЧ**. — Наогул хваробы косна-мышачнай сістэмы ўваходзяць у першую тройку найбольш распаўсюджаных класаў захворванняў сярод дарослай папуляцыі нашай краіны, а таксама шэрагу краін Еўропы. Наперадзе — толькі хваробы сістэмы кровазвароту і органаў дыхання. Тлумачыцца гэта не толькі глабальным старэннем насельніцтва, але і маларухомым ладам жыцця, нерацыянальным харчаваннем і іншым...

Стабільна расце і захваральнасць косна-мышачнай сістэмы сярод дзяцей і падлеткаў. Самым інвалідызуючым у дзіцячым узросце з'яўляецца ювенільны рэўматоідны артрыт. У нашай краіне актыўна вядзецца работа па паляпшэнні ранняй дыягностыкі гэтага захворвання, своечасовага прызначэння базіснай тэрапіі. Актыўна ўкараняюцца сучасныя стандарты лячэння, назапашваецца вопыт прымянення прэпаратаў біялагічнай генна-інжынернай тэрапіі для дзяцей. На базе лячэбных устаноў праводзяцца і школы для пацыентаў з бацькамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# АД ПЕРАЯДАННЯ ЗАСТРАХУЕ... «РАЗУМНАЯ» БЯЛІЗНА

**Амерыканскія навукоўцы распрацавалі бюстгальтар, датчыкі ў якім дазваляюць адсочваць настрой жанчыны і пры стрэсе адпраўляюць ёй на смартфон паведамленні аб небяспецы звязанага з ім пераядання.**

Даследчыкі ўстанавілі, што палова ўдзельніц эксперымента схільныя падчас стрэсу шмат есці, а трымаць сябе ў руках ім дапамагае своечасовы напамін пра такую тэхніку мінімізацыі стрэсу, як, напрыклад, дыхальныя практыкаванні.

Даследчыкі ўбудавалі ў бюстгальтар прыборы для электракардыяграфіі і вымярэння электраправоднасці скуры, якая змяняецца, калі чалавек пацее, што можа сведчыць аб хваляванні, а таксама гіраскоп і акселерометр.

Жанчыны, якія тэсціравалі распрацоўку, павінны былі на працягу чатырох дзён па 4—6 гадзін перадаваць навукоўцам звесткі аб сваіх эмоцыях. Супаставіўшы гэтыя звесткі з паказаннямі прыбораў, навукоўцы змаглі стварыць алгарытм, які распазнаваў хваляванне жанчыны з 75-працэнтнай дакладнасцю.

Навукоўцы тлумачаць, што выкарысталі бюстгальтар таму, што ён дазваляе размясціць прыбор для запісу кардыяграмы блізка да сэрца. Таму спробы стварыць аналагічнае адзенне для мужчын сутыкнуліся з пэўнымі цяжкасцямі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Дабрачыннасць

# ДАПАМАГЧЫ МАРЫНЕ

**13-гадовая ўкраінская дзяўчынка Марына Ласкутова імкнулася стаць сапраўднай мастацкай гімнасткай, удзельнічаць у буйных міжнародных спаборніцтвах, на яе разлічвалі трэнеры, але ўрачы нечакана паставілі ёй страшны дыягназ — рак ныркі.**

Сёння Марына знаходзіцца ў Бараўлянах, і для яе далейшага лячэння неабходна яшчэ сабраць больш за 100 тысяч еўра. Прыемна, што ў Беларусі сапраўды хапае тых, хто гатовы адгукнуцца, дапамагчы людзям у цяжкай сітуацыі. Пытанне аб дапамозе Марыне Ласкутовай адразу актыўна падтрымалі дзяўчаты-»мастачкі», а наш спартыўна-дабрачынны праект «Мары здзяйсняюцца» вырашыў правесці адмысловы сутачны марафон «24 гадзіны. Сэрца Марыны», сродкі ад якога пойдуць на лячэнне юнай гімнасткі.



На бегавую дарожку сталічнага легкаатлетычнага манежа, што на вуліцы Каліноўскага, 14 і 15 снежня выйдуць футбалісты, зборная краіны па лёгкай атлетыцы, гімнасткі, баскетбалісты, валейбалісты, фан-клуб Максіма Мірнага, хакеісты, барцы, нават тэатралы і нашы вядомыя медыяперсоны. Але паўдзельнічаць у марафоне можа любы ахвотны і ў любы час. Вам проста трэба зарэгістравацца, пакінуць заявачны ўнёсак (мінімум 20 000 бел. руб.) і прабегчы не менш за 200 метраў. Забегі пачнуцца ў суботу а 15:00 і завершацца роўна праз 24 гадзіны. Дапаможам Марыне разам!

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.**

■ Інфарм-укол

# НЯМА НАДЗЕІ — ХОЧАЦЦА ЭЙФАРЫІ

**Замежныя вучоныя высветлілі, што менш шанцаў набыць нарказалежнасць маюць тыя дзеці і падлеткі, з якімі дарослыя праводзяць як мага больш часу. Наогул вядома некалькі важных момантаў, здольных падштурхнуць маладых людзей да ўжывання наркотыкаў, кажа валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ.**

**Сацыяльны аспект.** Калі ў той сацыяльнай групе, да якой сябе адносіць чалавек, ужываецца тытунь, алкаголь або наркотык, то аднойчы можа ўзнікнуць жаданне менавіта такім чынам падкрэсліць сваю прыналежнасць да гэтай групы.

**Задавальненне.** Жаданне перажыць прыемныя ці проста незвычайныя адчуванні.

**Даступнасць.** Нелегальнае ўжыванне наркотыкаў будзе вышэй там, дзе яны больш даступныя, напрыклад, — у буйных гарадах.

**Цікаўнасць.** Жаданне даследаваць, а што ж гэта такое, таксама мае месца.

**Варожасць.** Калі чалавек не прымае грамадства, самога сябе, свае надзеі, адчувае сябе ізаляваным, то нараджаецца неадэкватная рэакцыя.

**Збег ад стрэсу.** Не ўсе ўмеюць спраўляцца з фізічным і псіхалагічным болем. Гэтаму трэба вучыцца. Аднак не ва ўсіх ёсць і добрыя настаўнікі.

**Бацькоўскі прыклад.** Калі бацькі дэманструюць дзецям сваю залежнасць, на апошніх гэта дзейнічае як прыклад для пераймання.

Спецыялісты адзначаюць некалькі момантаў змянення ў паводзінах і знешнім выглядзе таго, хто ўжывае наркотыкі:

1. Закрытасць ад блізкіх. Частая, працяглая адсутнасць дома.
2. Санлівасць або бяссонніца.
3. Прагулы. Страта цікавасці да вучобы і былых заняткаў.
4. Пагаршэнне памяці і ўвагі. Непазбежнае зніжэнне паспяховасці ў вучобе.
5. Пошук грошай. Знікненне грошай з бацькоўскага кашалька.
6. Запушчаны знешні выгляд. Неахайнасць у думках, адзенні і гігіене.
7. Раздражнёнасць. Хваравітая рэакцыя на заўвагі.

Скура можа быць занадта бледнай або пачырванелай, зрэнкі пашыранымі або звужанымі, вочы — чырвонымі або мутнымі, мова — запаволеная або паскораная, апетыт — страчаным або ўзмоцненым, каардынацыя — дрэнная, артэрыяльны ціск — нестабільны, расстройства страўнікава-кішачнага тракта. Прыўзняты настрой, эйфарыя могуць раптоўна змяняцца незадаволенасцю.

Размову з падлеткам трэба пачынаць, калі вы — у спакойным стане, а дзіця — не пад уплывам наркотыкаў. Будзьце гатовы да таго, што дзіця паспрабуе іграць на вашых пачуццях. Калі вы акажацеся слабей за наркатычную залежнасць вашага дзіцяці, звяртайцеся да спецыялістаў — урачоў-нарколагаў, псіхолагаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# МЕНШ «ХІМІІ» ДЛЯ НЕМАЎЛЯТ

**Стварэнне дзіцячых аддзяленняў інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі, выязных рэанімацыйных брыгад павялічыла выжывальнасць дзяцей, народжаных з экстрэмальна нізкай вагой (каля 1000 г), да 75 працэнтаў.**

Паводле слоў **загадчыцы лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Маргарыты ДЗЕВЯЛТОЎСКАЙ**, нізкай дзіцячай смяротнасці ў нашай краіне спрыяла рэарганізацыя родадапаможных устаноў па прынцыпе рознаўзроўневых перынатальных цэнтраў. У краіне функцыянуе 41 перынатальны цэнтр, з якіх трэці ўзровень маюць 13 устаноў, другі — 27 і чацвёрты — РНПЦ «Маці і дзіця». У апошнім развіваецца тэхналогія рэабілітацыі дзяцей з паталогіямі нервовай сістэмы. У якасці замяшчэння медыкаментознай тэрапіі сёлета пачала выкарыстоўвацца гіпербаратэрапія. Змяншэнне колькасці лекавых сродкаў пры лячэнні і рэабілітацыі немаўлят — інавацыйны кірунак, у якім працуе «Маці і дзіця».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Будзь пільным!

# НА ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ — ЛЮСТЭРКА-НЕБЯСПЕКА?

**Колькасць траўмаў няўхільна расце. Часам іх прычынай становяцца сітуацыі, якія мы нават не разглядаем як небяспечныя.**

— Яшчэ на пачатку 2000-х я звяртаў увагу транспартных службаў сталіцы на магчымасць атрымання траўмаў ад люстэркаў задняга віду гарадскіх аўтобусаў і тралейбусаў, — кажа **ўрач-валеолаг Мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансера Леанід МЯЛЕШКА**. — Гэтыя люстэркі вынесены на доўгіх кранштэйнах на вышыні росту чалавека, а таму падчас руху транспарту служаць патэнцыяльнай крыніцай небяспекі. Мне неаднойчы даводзілася назіраць, як люстэрка праносіцца каля галавы чалавека, які спяшаецца зайсці ў аўтобус... Вядомы нават выпадак гібелі чалавека менавіта ад такой траўмы. Ступень небяспекі значна ўзрастае ў цёмны час сутак.

На маю думку, падчас вытворчасці аўтобусаў і тралейбусаў неабходна было б прадугледзець бяспечную вышыню замацавання люстраў. Не перашкодзіла б нанесці на прыпынках і абмежавальную лінію (як на станцыях метро), за якую не варта заходзіць да поўнага спынення транспарту.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 46 (216)



■ Асоба

# ЗНІТАВАННЕ

## ГАБЕЛЕНЫ ГАЛІНЫ КРЫВАБЛОЦКАЙ ЯК СУВЯЗЬ ЧАСОЎ

Вось жа дзіва: нават тонкія ніткі могуць сшываць, умацоўваць, утрымліваць нейкія часткі ў адзіным. Нездарма ж у беларускай мове ёсць такое цудоўнае слова: знітаванне. І нібыта нябачныя нітачкі звязваюць любоўю людзей, трымаюць іх разам і ўтрымліваюць на нейкім месцы, якое становіцца самым любімым на зямлі. Невыпадкова адно з традыцыйных беларускіх мастацтваў заснавана на ўменні працаваць з ніткамі, рабіць з іх не проста тканіны, а творы мастацтва — габелены і нават цэласныя кампазіцыі.

Мастачка Галіна Крываблоцкая ў свае габелены ўплятае ўласнае разуменне свету і адчуванне Сусвету. Кросны — як праваднік у гэты Сусвет. Нітачка да нітачкі, колер да колеру, думка да думкі, пачуцці… Апошніх — шмат. І калі разабрацца ў тым, з чаго пачыналіся творы, прадстаўленыя на выставе «У пошуках вясны», што размешчана ў Палацы мастацтва, то першасным вузельчыкам заўсёды было пачуццё, да якога дадавалася яшчэ нешта…

### МЕЛОДЫЯ

«Актава». Так называецца твор 1978 года, адзін з першых этапных у мастачкі. Чырвонае з чорным на шэрым… Спалучэнне фігур у пэўным рытме. Малюнак геаметрычны, але ў ім нібыта зашыфраваны пэўны код. Расшыфраваць — значыць пачуць гукі. Шмат гукаў, у кожнага сваё месца, свая задача. Як ёсць пэўныя задачы ў традыцый, якія закладваліся ў культуры народаў. Адна традыцыя выпадае — і актава не поўная. Гэты твор у Галіны Крываблоцкай нарадзіўся на фоне ўздыму ідэі аднаўлення нацыянальных традыцый, якая, магчыма, ужо гучала недзе ў паветры. Гэтую мелодыю мастачка падхапіла і ўпляла ў габелен, у якім адчуваецца эксперыментальны дух, але пры гэтым ёсць адчуванне повязі з традыцыяй: усё роўна кожны чалавек носіць у сабе мелодыю сваёй зямлі, свайго роду.

**Ларыса ФІНКЕЛЬШТЭЙН, мастацтвазнаўца:**

*«Габелен і мастацкае шкло ў першую чаргу былі візітоўкай беларускага мастацтва на Саюзных выставах. Творчасць Галіны Крываблоцкай — гэта адлюстраванне традыцый з аднаго боку, а з другога — увасабленне эксперыментальнага тэкстылю».*

### ЛЮБОЎ

Бацька… Яго няма — адышоў у іншы свет. Сказала сабе: «Вось і ўсё»… Прыйшла ў майстэрню са сваім сумам, думкі плылі… А рукі рабілі сваю справу. Праз ніткі выявіўся душэўны стан, які паяднаў космас з зямлёю, матэрыяльнае з ледзь улоўным: блакітным аблокам ірвецца да неба светлая душа. «Вось і ўсё» — твор-прысвячэнне, якіх у Галіны Крываблоцкай шмат, таму што шмат людзей, з якімі яна была знітавана любоўю.

Кампазіцыя з чатырох алоўкаў — таксама зроблена з любоўю. Ніткі выстраіліся ў шэрагі, закруціліся вірам, як пачуцці. У шэрагах нітак растварыліся слёзы. Гэта прысвячэнне брату, мастаку Віктару Маркаўцу, які заўсёды быў моцны, светлы чалавек. Але нечакана адышоў у іншы свет.

— Алоўкі — наш сімвал з дзяцінства,— тлумачыць Галіна.— Нас чацвёра дзяцей у сям'і: тры сястры і старэйшы брат Віктар. Калі мама атрымлівала свой настаўніцкі заробак, то купляла нам у падарунак алоўкі. У кожнага з дзяцей былі свае алоўкі, мы імі вельмі любілі маляваць, таму ўсе выраслі творчымі людзьмі.

Твор «Апошнія ліхтары» — таксама прысвячэнне: дзеду Аляксандру і бабулі Марыйцы.

— Бабуля з роду Янкоўскіх, адукаваная, інтэлігентная была жанчына, дзед — вельмі духоўны чалавек, які скончыў царкоўна-прыходскую школу. Яны дапамагалі бацькам нас выхоўваць, даглядаць. І пакінулі нам у спадчыну веру, якой мы прытрымліваемся і якую перадаём сваім дзецям.

### ВЕРА

Унікальныя творы — габелены. Адчуваеш побач з імі нейкае цяпло, якое ідзе, напэўна, не толькі ад нітак. Таму што ў іх можна растварыць духоўны стан — як у творы «Цуд дрэва».

— Часам чалавеку даецца магчымасць пабываць у святых месцах,— гаворыць мастачка.— Аднойчы я была ў гасцях у Святога Мікалая з Мір Лікійскіх. Пашчасціла на яхце паплыць у Міжземнае мора, пасярод якога быў цудоўны маленькі востраў. На ім паміж скал расло старое-старое, але моцнае эўкаліптавае дрэва. Яно мяне так уразіла, што захацелася перадаць адчуванне моцы жыцця, якое напаўняла мяне ў той момант.

Мастакі — людзі тонкіх пачуццяў, якія, напэўна, адчуваюць нябачны свет, прастору, іншае вымярэнне, якое немагчыма зафіксаваць дакладнымі прыборамі. Але яно ёсць: паглядзіце творы Галіны Крываблоцкай. Вялікая частка яе габеленаў напоўнена светлымі, радаснымі колерамі, яны дыхаюць спакоем і пяшчотай. І ў іх жывуць анёлы!

— Ёсць у мяне твор — прысвячэнне анёлам. У кожнага чалавека ёсць добры і дрэнны анёл,— разважае Галіна.— На левым баку ў нас добры, цёплы анёл, на правым сядзіць халодны, злосны. Бываюць моманты ў чалавека, калі ў душы нібыта нешта кіпіць: гэта нашы анёлы спрачаюцца. Мы гэта не заўсёды разумеем. Але калі добра папрасіць Бога: «Паміры маіх анёлаў»,— то ўсё стане на месца. А калі нас пакідае дрэнны, цёмны анёл і застаецца светла-залаты, то мы адчуваем стан Боскай ласкі і асалоды і нібыта лунаем над усім тым, што ідзе ад цёмнага анёла. Людзі змагаюцца ўвесь час за нешта: за жыццё, за праўду. У гэтым свеце ўвесь час трэба змагацца, найперш за душу…

### БОЛЬ

Але бывае, што змаганне ідзе праз боль. Боль бывае агульным і вельмі моцным. І нават калі на твой лёс агульны боль не выпаў, то ўсё роўна ён нібыта ў крыві пакаленняў жыве. І прарывае. Габелен-рэквіем «Трасцянец» — агульная памяць пра Вялікую Айчынную вайну. Адзін з першых беларускіх аб'ёмных габеленаў, створаны ў 1984 годзе. Гэты адметны твор зараз знаходзіцца ў музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Маскве. Летась ён быў прадстаўлены на выставе да юбілею Перамогі, пра што беларускай мастачцы спецыяльна паведамілі і павіншавалі яе. На аўтарскай выставе ў Палацы мастацтва Галіна Крываблоцкая



паказала, як выглядае памяць у габелене. І дала магчымасць гэта пабачыць — у іншых творах. Яе творы, дзе ёсць боль, адметныя. Ці то аб'ёмныя — як «Трасцянец». Ці то незвычайныя па форме: габелен, прысвечаны паўстанню 1863 года, выкананы ў форме трохкутніка. Вельмі авангардная форма для твора, асабліва калі ведаць, што ён быў зроблены ў 1988 годзе, да гадавіны паўстання Каліноўскага, якому была прысвечана тады вялікая выстава айчынных творцаў.

На выставе вылучаецца габелен «Шлях». Глядзіш і бачыш: падвоенае сонца, расколатая зямля. Земляныя колеры. Колеры нашай зямлі. Чарнобыль…

— Мяне так узрушыла тое паведамленне! Было невядома, што гэтая катастрофа нам прынесла,— успамінае спадарыня Галіна.— Мы тады працавалі з братам у майстэрні. Усё ўнутры кіпела, і я намалявала гэты вобраз, пачала ткаць…

### ЗАХАПЛЕННЕ

Праз боль, праз змаганне ўсё роўна прарастае надзея. І сонца зноў адно, і па зямлі расцякаецца яго святло чырвонымі плямкамі, як у працы пад назвай «Дзень». Радасцю напаўняе новы дзень — нават ад таго, што ён прыходзіць і ўсё ідзе сваёй чаргой: дрэвы растуць, птушкі пяюць, слімакі выпаўзаюць. У Галіны Крываблоцкай слімакі — адзін з любімых вобразаў:

— У многіх маіх творах можна ўбачыць гэтую істоту, якую я вельмі паважаю. На зіму яна знікае, а вясной з'яўляецца — як сімвал цеплыні і аднаўлення жыцця. Вось слімачок у нацюрморце «… І зноў дзень»: Вялікдзень, яйкі на стале, пачатак новага жыцця…

Сёлета спадарыня Галіна стварыла 5 новых работ. Адна з іх — «Салаўіны спеў». Але самога салаўя ў ёй не варта шукаць. Затое можна адчуць стан чалавека, які слухае прыгожыя спевы



салаўя, адчувае спакой, радасць, замілаванне і захапленне жыццём. Калі чалавек адкрыты для захапленняў, то знаходзіць іх у звычайных рэчах і з'явах. І тады з'яўляюцца міні-габелены як імправізацыі з нітак, невялікія творы з цыкла «Дыялог з прыродай», ці ўдумлівыя — як з цыкла «Дрэвы». Ці вялікія і маштабныя — як «Мелодыя зямлі». Гэты габелен створаны для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Манументальных твораў у спадарыні Крываблоцкай шмат — для афармлення інтэр'ераў залаў, заслон для палацаў культуры, некаторыя знаходзяцца ў музеях. Розныя па тэмах, памерах, задачах. Але яны знаходзяць сваё месца ў прасторы і часе, нясуць сваю філасофію — праз ніткі. А калі паглядзець на кампазіцыю з пляцення пад назвай «Каардынаты быцця», то наогул нібыта чуеш вершы.

**Паэт Алесь РАЗАНАЎ:**

*«У мастацтва адна крыніца, якое б яно ні было: ці слоўнае, ці візуальнае. Калі аказваешся на выставе, то сутыкаешся з самой з'явай мастацтва. Але кожны мастак фармулюе па-новаму, што гэта ёсць. Тут адбываецца фармуляванне самой з'явы мастацтва. У яе ёсць адзін самы важны фактар — субстанцыя душы. Гэта тая крыніца, адкуль бяруцца ўсе творы».*

— Гэтую назву я падгледзела ў Алеся Разанава, у яго ёсць такая кніжка. Але яна вельмі падыходзіць да твора. Тут ёсць барацьба, якая стварае наша жыццё. Тут Сусвет. Цяпло ад зямлі, сонца, агню. Еднасць сутнасцяў, з якіх складаецца наша быццё…

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Прэм'ера

# УСЛЕД ЗА ПРЫВІДАМ

## НАШ ВАРЫЯНТ «ЛЯТУЧАГА ГАЛАНДЦА»: НЕ ТРЭБА АХВЯР

Ох, ужо гэтыя рамантычныя закаханыя дзяўчаты! Прыдумаюць сабе героя, не, каб на свайго даўняга прыяцеля ўвагу звярнуць, на таго, хто ўвесь час побач. Чаму Сента нейкага таямнічага незнаёмца з бледным тварам абрала? Адна справа — яе бацька: Даланду толькі б багацце ў рукі ішло. Але ж ёй жа жыць з гэтым Галандцам… Лятучы Галандзец — прывід, які са сваім караблём раз на сем гадоў атрымлівае магчымасць прыстаць да берага, каб знайсці каханую, якая будзе яму заўсёды вернай і вызваліць яго ад праклцяцця. Інакш — вечнае блуканне. І не было такіх жанчын дагэтуль. А ў Сенту паверыў, пакахаў і пашкадаваў губіць. Яна сама была гатова згубіць сваю душу дзеля яго…

Не, толькі не ў нас, не ў Беларусі! Не трэба нявінных ахвяр! Ханс-Ёахім Фрай з Германіі, запрошаны нашым тэатрам да працы ў якасці рэжысёра, разумеў, што, каб паставіць у Беларусі оперу Рыхарда Вагнера «Лятучы Галандзец», трэба ўлічыць нярпостую гісторыю ўзаемаадносін паміж двума народамі. І прапанаваў сваё бачанне фіналу. Зрэшты, паводле аўтара, Сента хоць і кідаецца ў мора, каб даказаць сваю адданасць каханаму, але ж становіцца істотай з іншага свету і злучаецца з ім — свайго роду таксама хэпі-энд. Але навошта тапіцца, калі можна гэтага не рабіць?..

— Мы імкнуліся, каб пластычная мова пастаноўкі была зразумелая для гледача, які ніколі не бачыў гэты спектакль. Глядач бачыць, як рэшткі карабля Лятучага Галандца ўзнімаюцца з глыбінь мора. У той час Сента жыве ў сваімі маленькім закрытым свеце недзе на поўначы Нарвегіі, марыць пра прынца. Цэнтральная кропка маёй працы — адносіны Сенты з Лятучым Галандцам. Сента бачыць вызваленне праз каханне, але яна не прыносіць сябе ў ахвяру для кахання. Яна скажа яму: я гатова ісці з табой. Ён яе возьме ў сваё падарожжа. Гэтае падарожжа — бясконцасць,— тлумачыў рэжысёр сутнасць сваёй задумы.

Задума тэатра — запрасіць да працы над операй Вагнера нямецкага пастаноўшчыка — палягала ў тым, што складаны твор лепш адчуе і данясе носьбіт аднаго з аўтарам менталітэту. Яшчэ адзін аргумент на карысць Ханса-Ёахіма Фрая: ён 10 гадоў быў дырэктарам Дрэздэнскага опернага тэатра, дзе ў 1843 годзе адбылася прэм'ера оперы «Лятучы Галандзец». У Дрэздэнскім тэатры выконваецца ўвесь рэпертуар Вагнера. А калі Фрай пачынаў у ім працаваць, то ў афішы была нават пастаноўка ўнука Вагнера.

Несці нямецкую культуру ў Беларусь пастаноўшчык вырашыў без лішняга пафасу, зрабіўшы акцэнт на станоўчых момантах. Уверцюра напачатку стварае вобраз неспакойнага, небяспечнага мора: мы бачым хвалі, якія накатваюць зноў і зноў. Неспакой ахінуў бы душу… Каб не хлопчык і дзяўчынка, якія загадкава прабягаюць па сцэне: пачынаецца рамантыка… Каманда-прывід Лятучага Галандца з'яўляецца на палубе — нібыта пераходзіць з іншага вымярэння. Так, загадкавыя людзі, але абсалютна рэальныя пры гэтым: чаго іх баяцца? Свет Сенты наогул прывабны: недзе ў гарах жанчыны сядзяць у крэслах-качалках: так абыгрываецца вобраз калаўрота. Фрай прызнаўся, што працытаваў такім чынам Томаса Мана з рамана «Чароўная гара». Горнае паселішча напаўняецца колерамі пры першай сустрэчы Сенты і Галандца. Эрык з жыхарамі не хоча аддаваць Сенту незнаёмцу: змаганне за яе душу ўвасабляецца ў перацягванні каната. Але ўсё роўна яна робіць выбар, і закаханыя разам накіроўваюцца ў іншы свет. З тымі самымі дзеткамі: магчыма, яны павінны былі несці думку пра тое, што ёсць нейкае наканаванне, вызначанае лёсам? Загадкава. Можа, гэта задумана, каб падкрэсліць рамантычнасць оперы?.. У выніку атрымалася па-нямецку рацыянальна, нягледзячы на тое, што за сцэнаграфію адказваў расійскі мастак Віктар Вольскі. Ён стварыў зборна-разборную канструкцыю, якая з'яўляецца то палубай, то хатай, то прычалам. Але ўсё па-нямецку лаканічна. Галоўны акцэнт робіцца на самой оперы Вагнера «Лятучы Галандзец», якую ёсць магчымасць паслухаць у Беларусі ўпершыню.

І па-нямецку: паколькі оперы гучаць на мове арыгінала, то артысты спецыяльна займаліся з выкладчыкамі (не ведалі нямецкай мовы). Партыю Галандца выконвае Станіслаў Трыфанаў. На ролю Сенты Фрай абраў заслужаную артыстку Беларусі Ніну Шарубіну і маладую салістку Алену Золаву, якая спраўляецца са складанай партыяй. Даланд — народны артыст Беларусі Васіль Кавальчук. Ад іх патрабавалася на мове Вагнера данесці яго ж ідэю, што вельмі няпроста: кампазітар напісаў складаныя партыі як для салістаў, так і для музыкантаў аркестра. Але гэта адна з самых кароткіх опер Вагнера…

**Ларыса ЦІМОШЫК**



*У дырыжора-пастаноўшчыка была асаблівая місія: дамагчыся вагнераўскага гучання разам з аркестрам Вялікага тэатра Беларусі. **Манфрэд Маерхофер** распавядае:*

*— Вагнер — новы кампазітар для гэтага аркестра. Аднойчы пасля рэпетыцыі першы кларнет сказаў: «Як жа ўсё цяжка…» Мне ўсё зразумела: тут амаль 40 гадоў не выконваўся Рыхард Вагнер. «Лятучы Галандзец» — твор, які, па сутнасці, рэвалюцыйны. Дзякуючы яму Вагнер стварыў новы музычны стыль. Напрыклад, трубы і іншыя медныя інструменты дагэтуль ніколі не ігралі такіх высокіх гукаў. Такая складанасць партыі для валторнаў, як у Вагнера, наогул не сустракаецца ні ў аднаго кампазітара. Быў нават такі выпадак: калі ішла падрыхтоўка да прэм'еры «Трыстана і Ізольды», бацька Рыхарда Штрауса, які іграў у аркестры, узяў сваю валторну і падаў дырыжору са словамі: «Бяры, паспрабуй сыграць гэта…» Вагнер, які сам дырыжыраваў, сказаў: «Не, гэта твая праца. Я сачыніў, а табе іграць…» Музыка «Лятучага Галандца» складаная. Гэта адчуваецца і па працы хору, асабліва мужчынскага. Уявіце: васьміגалосны мужчынскі хор, вельмі шмат фортэ, таму што хочацца дасягнуць асаблівага эфекту, каб падкрэсліць сутнасць істот з іншага свету. Але ў гэтым творы асаблівы і жаночы хор. Для мяне гэта найскладанейшы жаночы хор, які сустракаецца ў музычнай літаратуры. Да таго ж спадар Фрай дадаў яму пэўныя рухі, на што кіраўнік хору тэатра Ніна Ламановіч сказала: «Не, з гэтымі рухамі такі хор выконваць немагчыма». Але мы дасягнулі патрэбнага гучання. Рэжысёр паклапаціўся пра тое, каб спевакам было зручна бачыць дырыжора, і гэта ўпісалася ў агульную карціну. Драматычны барытон, які па волі Вагнера ўвасабляе ў гэтай оперы галоўнага героя, дагэтуль у музычнай літаратуры не сустракаецца. Што тычыцца ролі Даланда (бас) — абсалютную глыбіню кампазітар уздымае да вяршынь. З аднаго боку, яму патрэбны былі вельмі моцныя галасы, а з другога боку, гэтыя галасы павінны быць прыгожыя, каб выканаць пэўную арыю. Гэта была першая опера, калі Вагнер сам сабе прызнаўся, што тут яму ўдалося рэалізаваць найвышэйшае майстэрства. Опера «Лятучы Галандзец» не магла мець поспеху ў часы Рыхарда Вагнера, таму што тады галасы не былі настолькі тэхнічна развітымі. Але гэты твор стаў адным з самых папулярных у нямецкай музыцы.*

■ Конкурс

# Калядныя спевы

## У БЕЛАРУСІ ЗАСНАВАНЫ МІЖНАРОДНЫ КОНКУРС ВАКАЛІСТАЎ

**Пра гэта паведаміў у дні адкрыцця Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Уладзімір Грыдзюшка. Конкурс пройдзе ў снежні 2014 года ў Мінску. Арганізатарам выступае Вялікі тэатр Беларусі.**

Удзельнікамі конкурсу могуць стаць вакалісты і вакалісткі, якія маюць спецыяльную музычную адукацыю альбо вучацца. Але могуць быць і выключэнні: асобы без музычнай адукацыі павінны прадставіць у аргкамітэт відэазапіс з выкананнем дзвюх арый кампазітараў розных эпох. Конкурс будзе праводзіцца ў тры туры.

Напэўна, практыка мінулага года, калі падчас Каляднага опернага форуму праходзіў міжнародны конкурс вакалістаў, падалася тэатру ўдалай: была інтрыга, за якой сачыла публіка, гледачы хваляваліся за сваіх фаварытаў, за айчынных спевакоў. Зрэшты, менавіта дзеля іх і патрэбны такі конкурс: у актыўным сцэнічным спаборніцтве здабываецца важны для артыста вопыт.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Гасцёўня «Звязды»

# Сучасныя чытачы — «мабільныя»

**Дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі імя Леніна Аляксандр СЁМКІН нядаўна адзначыў 60-гадовы юбілей. Ён распавёў карэспандэнту «Звязды» пра свой самы фантастычны падарунак, а таксама падзяліўся асабістымі і творчымі планамі дружнага калектыву бібліятэкі.**

**— Аляксандр Іосіфавіч, сярод падарункаў былі вельмі нечаканыя?**

— Рыбку залатую ў маленькім акварыуме падарылі, каб выконвала ўсе мае жаданні. Але насамрэч фантастычным падарункам лічу кнігу з публікацыямі маіх інтэрв'ю за шмат гадоў працы на пасадзе дырэктара. Узначальваю калектыў з красавіка 2002 года. А раней жыў у Дуброўне, дзе, пачынаючы з 1990 года, працаваў загадчыкам аддзела культуры райвыканкама.

Выданне мае назву: «Да юбілею дырэктара ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя Леніна. Бібліятэкар № 1». Уявіце сабе, надрукавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы.

Атрымаў віншаванні і ад былых калег з Дубровенскага раёна, цяперашніх — з іншых абласцей, а таксама класіка нашай драматургіі Аляксея Дударава.

**— Дарэчы, у вашай бібліятэцы быў зроблены бібліяграфічны паказальнік, прысвечаны Дудараву.**

— Так. Ён быў так прыемна здзіўлены, што некалькі хвілін сказаць нічога не мог ад радасці. А потым шчыра дзякаваў за вялікую працу. Хочацца таксама падзякаваць калектыву за паказальнік, прысвечаны славутаму кампазітару, сыну віцебскай зямлі Анатолю Багатырову, у гонар якога названа адна з вуліц абласнога цэнтра, а таксама дзіцячая школа мастацтваў. Мы вырашылі, што абавязкова трэба зрабіць бібліяграфію, прысвечаную гэтаму геніяльнаму чалавеку.

А вось, паглядзіце, вялікая праца пра вайну 1812 года, надрукаваная летась. Каштоўнасць гэтага навуковага выдання ў тым, што нам удалося на яго старонках сабраць разам персоны і падзеі, якія адбываліся ў час той вайны на тэрыторыі Віцебскай губерні. Такую нялёгкую працу зрабілі супрацоўніцы аддзела краязнаўства. Ім дапамагалі людзі і навукоўцы, якія захапляюцца або вывучаюць гэтую тэму.



Напрыклад, у Маскве жыве энтузіяст, які стварыў тэматычны сайт. Ён далёкі ад бібліятэчнай справы, ён — праграміст, які захапляецца гісторыяй. Падзяліўся інфармацыяй, якая нас цікавіла.

Распрацоўваем таксама вялікую колькасць метадычных матэрыялаў. Падлічылі, што надрукавалі 4,5 мільёна старонак (!) — і гэта толькі за апошнія тры гады — нашых паказальнікаў і іншых нашых бібліяграфічных выданняў. Спачатку падумаў, можа, памыліліся пры падліку. Пераправерылі, аказалася, што ніякай памылкі няма. Наклад большасці з гэтых выданняў ад 30 да 50 асобнікаў. Якасць паліграфіі высокая — у рукі ўзяць прыемна.

**— Сёння многія аддаюць перавагу электронным кнігам. Не адчуваеце недахопу чытачоў?**

— Сярод абласных бібліятэк у нас іх самая вялікая колькасць — каля 55 тысяч. Вядома, хочацца, каб было больш. Людзі пенсійнага ўзросту, можа, скажуць: калісьці ў бібліятэцы займалі чаргу ў гардэроб і гэтак далей. А цяпер… Проста цяпер вельмі мабільныя чытачы. У нас ёсць свой сайт, таму можна, нават не выходзячы з кватэры, пазнаёміцца з навінкамі літаратуры. Людзі выбіраюць тое, што іх цікавіць, а потым проста прыходзяць па кнігу. Прыйшоў, праз пяць хвілін узяў неабходнае ці зрабіў копію неабходных артыкулаў. Навошта яму сядзець у бібліятэцы? Уражанне можа скласціся, што чытальныя залы часта пустыя. Значыць, бібліятэкі не патрэбны? Але гэта не так. У нас праходзяць прэзентацыі выданняў, розныя акцыі: выставы і сустрэчы.

**— Ад супрацоўніц бібліятэкі пачуў, што распрацоўваюцца ўнікальныя праекты. Раскажыце, калі ласка, падрабязней.**

— Распрацоўваем электронныя рэсурсы. Адзін з іх прысвечаны 25-й гадавіне вываду савецкіх войскаў з Афганістана: «Афганістан без права на забыццё». Да 15 лютага прэзентуем гэтую працу ў канцэртнай зале «Віцебск». Спачатку была ідэя скласці спіс землякоў: хто служыў у легендарнай віцебскай 103-й мабільнай брыгадзе, якая першай увайшла ў далёкую краіну, каб выканаць інтэрнацыянальны доўг, а таксама ў транспартным авіяпалку — пра тых, хто родам, або неяк звязаны з Віцебскам і вобласцю. Але потым захацелася больш. Рэсурс напаўняецца, у тым ліку і дакументамі, там будзе нават відэа. Калі пачалі спісы вывяраць, нават не думалі, што наша праца дазволіць знайсці людзей, прозвішчы якіх не ўвайшлі ні ў «Афганскую кнігу памяці», ні ў спісы ваенкаматаў. Бо апошнія, зразумела, расфарміроўвалі і гэтак далей…

**Камп'ютарызацыя, інфарматызацыя, электронныя кнігі — усё гэта добра, але веру, што бібліятэкі будуць існаваць заўсёды. І традыцыйная кніга будзе. Ёсць людзі, якія пішуць, іншыя — выдаюць і чытаюць.**

Яшчэ адзін праект — аб сучасных мастаках Віцебска, членах Саюза мастакоў, якіх больш за 130 чалавек. Наведнікі сайта змогуць прачытаць і пра тых, каго, на жаль, больш няма з намі. Рыхтуюцца партфоліа кожнага мастака: з фота і біяграфіяй, бібліяграфіяй, галерэяй твораў, інфармацыяй аб выставах, у якіх браў удзел. Тэксты будуць на беларускай і на англійскай мовах.

**— Якія кнігі вы асабіста любіце чытаць?**

— Люблю вершы Пушкіна, Ясеніна. Для мяне кніга павінна быць светлай, несці пазітыў. А яшчэ, як ні дзіўна, падабаюцца любоўныя раманы. Не люблю дэтэктывы. Памятаю, пачынаў чытаць Агату Крысці, але не спадабалася. Не люблю чытаць пра вайну кнігі сучасных аўтараў. Бо яны ведаюць пра вайну з фільмаў і кніг... Творы тых аўтараў, якія самі прайшлі вайну, таго ж Сіманава, — па-іншаму ўспрымаюцца.

Мой бацька быў камандзірам Чырвонай арміі, вайну сустрэў у Беластоку. Ён сфарміраваў маё ўяўленне пра вайну, калі расказаў пра канцлагеры, дзе пабываў…

Не разумею неафашыстаў, якія выходзяць на вуліцу і нешта патрабуюць. Думаю, неэтычна абмяркоўваць вайну: хто меў рацыю, вінаваты, хто лепш камандаваў… Калі працаваў над «Кнігай памяці Дубровенскага раёна», шмат даводзілася чытаць архіўных дакументаў. І з архіваў вермахта таксама. Як можна, напрыклад, абмяркоўваць аперацыю «Баграціён», калі чытаеш, што па Дняпры цячэ не вада, а кроў…

**— У свой час прадракалі: тэлебачанне заменіць тэатр. Добра, што гэтага не здарылася. Цяпер часта пішуць, што інтэрнэт прывядзе калі-небудзь да закрыцця бібліятэк.**

— Абсалютна шчыра вам скажу: камп'ютарызацыя, інфарматызацыя, электронныя кнігі — усё гэта добра, але веру, што бібліятэкі як сацыяльны інстытут будуць існаваць заўсёды. І традыцыйная кніга будзе. Ёсць людзі, якія пішуць, іншыя — выдаюць і чытаюць. Будзе бібліятэка! Мо крыху ў іншай форме. І беларускія бібліятэкі, хай не так хутка, як хацелася б, але стануць такімі, як у Еўропе. Я быў у адной замежнай бібліятэцы — пры ўніверсітэце. Увесь фонд там у вольным доступе, і па выхадных таксама. У суботу і нядзелю там працуюць толькі ахоўнікі. Але можаш без бібліятэкара пачытаць кнігу, здаць… Безумоўна, мы маглі б зрабіць аналагічнае, але цана пытання вельмі дарагая.

**— Ідэя будаўніцтва новага будынка абласной бібліятэкі канула ў Лету?**

— Думаю, што яна абавязкова будзе рэалізавана. Але калі, адказаць на гэтае пытанне не магу. Калі нам далі заданне, мы распрацавалі канцэпцыю новай бібліятэкі. І верым у тое, што задуманае можна будзе ўбачыць у камені.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Не стварай сабе праблему

# НАВАГОДНІЯ ДРЭВЫ — ПАД УЗМОЦНЕНУЮ АХОВУ

**Напярэдадні калядных і навагодніх свят дзяржаўная лясная ахова пераходзіць на ўзмоцнены рэжым аховы лясоў для недапушчэння незаконных высечак хваёвых дрэў.**

Лясгасамі краіны будуць арганізаваны аператыўныя рэйдавыя мерапрыемствы па выяўленні і прыцягненні да адказнасці грамадзян, які незаконна высякаюць у лясным фондзе дрэвы. На аўтадарогах, якія праходзяць паблізу лясных масіваў, сумесна з ДАІ будзе выстаўлена больш за 300 кантрольных пастоў. Да рэйдавых мерапрыемстваў будуць падключацца і падраздзяленні МУС.

У прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі нагадалі, што самастойная нарыхтоўка дрэў без дазвольных дакументаў забаронена. Парушальнікам пагражае штраф ад 5 да 50 базавых велічынь у залежнасці ад таго, у лесе якой групы было высечана дрэва. Акрамя гэтага, ёсць таксы для вызначэння памеру пакрыцця шкоды, нанесенай лясам і аб'ектам раслiннага свету. Так, за незаконнае выманне, знішчэнне ці пашкоджанне дрэў і кустоў да ступені спынення росту, акрамя дрэў ці кустоў, размешчаных на землях населеных пунктаў, прымяняецца наступная такса: за адно дрэва дыяметрам каля пня 12 сантыметраў — у памеры 0,1 базавай велічыні. Калі канфіскаванае дрэва будзе з-за якіх пашкоджанняў непрыдатным да далейшай рэалізацыі, парушальнік абавязаны будзе выплаціць яшчэ 1 базавую велічыню за дрэва.

Грамадзяне, якія сталі сведкамі незаконнай высечкі дрэў, могуць паведаміць пра гэта ў Міністэрства лясной гаспадаркі па тэлефоне «гарачай лініі» (8-017) 200 46 01 (час працы з 9 да 18 гадзін, без выхадных) або пры дапамозе электроннага звароту на сайт міністэрства. Тэлефонныя «гарачыя лініі» будуць працаваць і ў падпарадкаваных Мінлясгасу арганізацыях — дзяржаўных вытворчых лесагаспадарчых аб'яднаннях і лясгасах.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН**. Тыдзень пройдзе паспяхова, калі не станеце звяртаць увагу на некаторыя раздражняльныя дробязі ў паводзінах навакольных. Не спяшайцеся з высновамі. Да вас могуць прад'яўляць завышаныя патрабаванні, якім будзеце вымушаны адпавядаць, каб не падарваць свой аўтарытэт.

**ЦЯЛЕЦ**. Падтрымліваючы адносіны з калегамі па працы, не будзьце з імі залішне адкрытымі, так, каб гэта не павярнулася супраць вас. У сярэдзіне тыдня магчымая камандзіроўка, вынікі якой станоўча адаб'юцца на далейшым службовым прасоўванні. Добра складаць планы на найбліжэйшую будучыню і, пачынаючы з наступнага дня, увасабляць іх у жыццё — тады пры мінімальных высілках вы можаце атрымаць максімальныя вынікі. Калі задумалі змяніць працу, то неабходна прадумаць усё да дробязяў.

**БЛІЗНЯТЫ**. Варта прабачыць сваім блізкім іх невялікія слабасці: не ўсе ж як вы настойлівыя і мэтанакіраваныя. Да серады вы будзеце заняты ўсім, чым заўгодна, але толькі не хатнімі абавязкамі, увільваючы ад рашэння нават самых неадкладных пытанняў. Прыемна здзівяць вынікі працоўнага кампрамісу, на які вас вымусяць пайсці.

**РАК**. Не варта ўпарціцца дарма, праявіце мудрасць, і ваша слабасць можа стаць сілай. Магчымыя канфлікты на працы, таму імкніцеся стрымліваць эмоцыі. Не спяшайцеся складаць кантракты. У чацвер многае можа давацца вельмі лёгка, але нічым важным і сур'ёзным усё ж лепш не займацца, бо існуе вялікая верагоднасць памылак. Субота спрыяльная для спраў, якія можна хутка скончыць.

**ЛЕЎ**. Не адкладвайце справы на потым, бо можаце іх вырашыць непасрэдна на гэтым тыдні. Да пятніцы таксама спрыяльнымі будуць зносіны з уплывовымі людзьмі, і верагодна — з начальствам. У пятніцу будзе мала шанцаў дамагчыся ад суразмоўцы разумення, асабліва калі існуе сур'ёзная розніца ва ўзросце ці становішчы.

**ДЗЕВА**. На гэтым тыдні асаблівае значэнне будзе мець сабранасць. Калі здарацца паездкі, то дзелавыя, калі сустрэчы і знаёмствы — то карысныя: яны абяцаюць нядрэнныя перспектывы. Любое ваша дзеянне павінна быць падпарадкавана мэце стварэння трывалага падмурка для выгадных дамоў і паспяховай працы. Вас можа наведаць маркотны настрой — вельмі пажадана маркоту спыніць. Не блытайце непаразуменне з канструктыўнай крытыкай — гэта зусім розныя рэчы. Заадно зможаце падправіць некаторыя свае слабыя месцы. Серада абяцае матэрыяльны прыбытак ад старых укладанняў, але наўзамен запатрабуе дэталёвай прапрацоўкі дзеянняў.

**ШАЛІ**. Калі партнёры робяць крок насустрач, то неабавязкова шукаць у гэтым падвох. Гэта амаль ідэальны тыдзень для таго, каб заняцца падрыхтоўкай і рэалізацыяй маштабных планаў. Могуць паступіць дзелавыя прапановы, якія дазволяць ступіць на чарговую прыступку кар'ернай лесвіцы. Пятніца — дзень гарманічнага рашэння праблем і ўдалы момант для цікавых і карысных знаёмстваў.

**СКАРПІЁН**. Будзеце адкрытыя для прапаноў, і яны пачнуць паступаць да вас у нарастальным тэмпе. У сярэдзіне тыдня вы можаце быць трохі безуважлівымі і нават забыцца пра свае прамыя абавязкі. Паспрабуйце засяродзіцца. Давярцеся сябрам, і яны могуць дапамагчы добрай ідэяй ці знойдуць для вас карысны занятак. У канцы працоўнага тыдня магчымыя канфлікты як з начальствам, так і з іншымі людзьмі. Але пазбегнуць непрыемных сітуацый вам па сілах.

**СТРАЛЕЦ**. Спатрэбяцца такія якасці як уважлівасць і мудрасць. Не грэбуйце дробязямі: вырашэнне нават малаважных пытанняў можа даць нечаканы, але вельмі прыемны вынік. Пажадана перастаць растварацца ў струменях эмоцый і ўзяцца за што-небудзь. Пошук новай працы можа ўвянчацца поспехам. Пачынаючы з серады, перш чым прыступіць да дзеяння, варта добра ўсё прадумаць: бессістэмныя ўчынкі поспеху не прынясуць.

**КАЗЯРОГ**. Пацешаць прыемныя сяброўскія сустрэчы і творчы ўздым, які прыхарошыць манатоннасць будняў. Працы чакаецца шмат, і тады хоць частку спраў можна будзе перакласці на надзейныя плечы партнёраў. Асноўную работу ўсё ж давядзецца выконваць самому, аб'ектыўна разлічваючы сілы і магчымасці. Жаданне зняць напружанне, адыгрываючыся на навакольных, варта задушыць у зародку — гэтым вы толькі сапсуяце адносіны і нічога не даможацеся.

**ВАДАЛЕЙ**. Добры тыдзень для пачатку працяглых вандраванняў, знаёмстваў з новымі людзьмі і для атрымання новых ведаў. Актывізуйце такія якасці як рашучасць і дзелавітасць, — тады не застаняцеся незаўважанымі. Аказвайце падтрымку толькі тым, хто вам сапраўды важны і цікавы, не марнуйце час і сілы. Паспрабуйце быць уважлівымі і паблажлівымі да блізкіх людзей, прабачце ім іх маленькія недахопы і слабасці і не крыўдзіце іх.

**РЫБЫ**. Даведаецеся шмат новага пра сваю працу. Паспрабуйце не змяняць нічога вакол, перачакайце буру, якая насоўваецца — інакш проста напружыце сваіх калег і на вас усе будуць глядзець скоса. Стан нявызначанасці можа прадоўжыцца ўвесь тыдзень. Але, пакуль не ўнесена яснасць, не прымайце нічый бок. Магчыма нацягнутасць у адносінах з калегамі, начальствам ці старэйшымі сваякамі. Гэта, хутчэй, вынік непаразумення. Пагаварыце з імі адкрыта. Будзьце больш лаяльнымі ў дачыненні да блізкіх.

# ПТУШКАЙ ГОДА СТАЛА ЗЯЗЮЛЯ



**Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) выбрала птушкай 2014 года зязюлю звычайную, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе АПБ. Ужо традыцыйна ў межах такой кампаніі будзе арганізаваны шэраг конкурсаў і мерапрыемстваў, мэта якіх прыцягнуць увагу да праблем гэтага віду.**

Нагадаю, што сёлета Беларусь далучылася да міжнароднай праграмы па спадарожнікавым сачэнні за звычайнай зязюляй. З дапамогай спецыяльных датчыкаў, якія замацоўваюцца на птушках, можна атрымаць інфармацыю пра іх месцазнаходжанне ў рэжыме рэальнага часу, што дазваляе вызначыць шляхі міграцыі і месцы зімоўкі. Такі метад дазваляе атрымліваць больш эксклюзіўнай інфармацыі аб гэтых крылатых. На пяці беларускіх зязюлях ужо з'явіліся датчыкі, а ў новым годзе плануецца сачыць яшчэ за дзесяцю птушкамі. На працягу некалькіх месяцаў спецыялісты АПБ назіралі, куды ляцяць беларускія Норберт, Віктар, Юлія, Філ і Павел. Спадзяёмся, што налета нашы чытачы з вялікім інтарэсам будуць разам з арнітолагамі працягваць сачыць за беларускімі зязюлямі.

«Лічыцца, што зязюлі — нашы птушкі, беларускія, але ў Беларусі яны праводзяць толькі тры месяцы на год. Большую частку года яны мігруюць альбо знаходзяцца на зімоўцы ў Афрыцы. Таму праз зязюлю мы хочам яшчэ раз звярнуць увагу на значнасць міграцый і зімовак для птушак. На тое, што захаванне міграцыйных відаў магчымае толькі ў трансгранічным кантэксце», — патлумачыў сваю пазіцыю дырэктар АПБ Віктар Фянчук.

Колькасць зязюль у Еўропе скарачаецца ў сувязі са зменамі вядзення сельскай гаспадаркі. У нашай краіне сітуацыя лепшая, таму айчынныя назіранні за зязюлямі дазволяць лепш зразумець асаблівасці біялогіі гэтага незвычайнага віду.

Нагадаю некалькі цікавых фактаў пра зязюлю. Заўсёды кукуе толькі самец, а голас самкі падобны да чалавечага рогату. З-за завостраных крылаў і паласатага малюнка на жываце падчас палёту зязюля нагадвае невялікіх драпежнікаў. Дзякуючы гэтаму самец зязюлі палохае птушку — гаспадара гнязда, а ў гэты час самка падкідвае яйка. Зязюлі хапае ўсяго 10-16 секундаў, каб падкласці яйка ў гняздо. Падкінутыя яйкі амаль супадаюць па колеры з яйкамі гаспадароў гнязда. Самка зязюлі за адзін сезон можа адкласці ад 8 да 25 яек, праўда, на кожныя 5 падкінутых яек вырастае толькі адно птушаня. Зязюля — далёкі мігрант. На зімоўку яна ляціць у Афрыку. Ляцяць птушкі часцей за ўсё не чарадой, а паасобку. Гэтыя птушкі ядуць вусеняў, пакрытых валаскамі, якіх іншыя птушкі не чапаюць. Так адбываецца з-за таго, што валаскі ўтыкаюцца ў асаблівае пакрыццё сценак страўніка птушкі, а потым гэтае пакрыццё выводзіцца са страўніка разам з валаскамі. Неверагодна, але ў паданнях многіх народаў зязюля з'яўляецца сімвалам дабрабыту.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Фестываль моды ў Гродне

14 снежня ў канцэртнай зале Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы адбудзецца фестываль моды Grodno Fashion Show. Ён праводзіцца моладдзю ў рамках праекта «Жывая гісторыя» пры падтрымцы Гродзенскага аблвыканкама. У выглядзе шоу з удзелам артыстаў розных жанраў будуць прадэманстраваны дасягненні ў галіне мадэлявання і дызайну адзення, новыя калекцыі пакажуць швейныя прадпрыемствы, салоны і крамы. Паказы фестывалю, партнёрамі якога з'яўляюцца вядомыя таварныя маркі, а 15 і 19 гадзіне.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Навуковая інтэграцыя па лініі інавацыйных тэхналогій

**З 16 па 21 снежня на базе Беларускага нацыянальнага тэхналагічнага ўніверсітэта будзе праведзены II форум праектаў Саюзнай дзяржавы ВНУ інжынерна-тэхналагічнага профілю.**

Плануецца, што ў форуме прымуць удзел вышэйшыя службовыя асобы Саюзнай дзяржавы і кіраўнікі 50 універсітэтаў Беларусі і Расіі, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе БНТУ. На мерапрыемстве будзе распрацаваны алгарытм узаемадзеяння па сумеснай падрыхтоўцы спецыялістаў будучыні для эканомікі Саюзнай дзяржавы, інтэграцыі навуковага патэнцыялу дзвюх суседніх краін па стварэнні інавацыйных тэхналогій.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:**

- страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР №№ 3036158-3036160, 3036145-3036146, 3036152, 3036154-3036155, 3455886-3455892, 3455878, 3036135-3036135;
- страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездок за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0588878, 0588879, 0588881;
- страховые сертификаты «Зеленая Карта» серии BY 12 №№ 9302493, 7621935-7621940, 9302004-9302005;
- квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 3338226;
- страховые полисы по договорам страхования, заключаемые с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК №№ 0122567-0122568.

УНП 100706519

**Считать недействительным** утерянный билет учащейся МГТК (торговли) БОБОК Алеси Игоревны, выданный 01.09.2011 года, утерянный 07.12.2013 года.

**В суд Борисовского района** поступило заявление Веретенниковой А.Н. об объявлении умершим гражданина МИХАЙЛОВА Александра Валерьевича, 23 ноября 1975 года рождения, уроженца г. Борисова Минской области, последнее известное место жительства которого в Республике Беларусь: г. Борисов, ул. Н-Неман, 153-28, последнее известное место пребывания: г. Москва, ЗАО «Газета.ру».

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данном гражданине, сообщить суду в течение двух месяцев со дня публикации объявления.

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 декабря 2013 года проводит 16-ый от 28.08.2013 повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности на 23-ем аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 335 | Мастерская ПМ-2-70 № С35123 1985 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 270 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 618044 дв. 291586-МРС-АР № 860 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 675017 дв. 562102-ТА-5 № С35123 на ЗИЛ-131 1985 г. ш. МО927872 дв. 767059 -АДБ-3122У1 № 1181 на пр.1-П-2,5 1985 г. ш. 0111 | г. Минск, в/ч 63755 | 118 000 000 | 11 800 000 |
| 336 | Мастерская ПМ-2-70 № Т35133 1986 г. 2 кат. в составе: -МРМ-М1 № 100 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 587304 дв. 143086 -МРС-АР № Д333 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 678017 дв. 572585 -ТА-5 № Т35133 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 0916733 дв.712403 -АДБ-3120У1 № 57202 на пр.1-П-2,5 1986 г. ш. 0060 | г. Минск, в/ч 63755 | 118 000 000 | 11 800 000 |

**Условия и порядок проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 217 от 19 ноября 2013 г.**

УНП 101099370

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:

**Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29.**

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БАЛАНС на 1 октября 2013 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 01.10.2013 | на 01.01.2013 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 385 798,5 | 412 171,2 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 13 325,0 | 9 531,0 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 398215,9 | 1 079 737,2 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 769881,0 | 1 811 192,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 936231,0 | 1 458 115,7 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 13696523,4 | 11 179 917,7 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 31,7 | 158,1 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | 15 219,2 | 13 970,8 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые, юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 149,4 | 149,4 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 915448,7 | 778 812,7 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 5991,0 | 0,9 |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Прочие активы | 1111 | | 301978,6 | 275 607,9 |
| 16 | ИТОГО активы | 11 | | 20438793,4 | 17 019 364,6 |
| 17 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 18 | Средства Национального банка | 1201 | | 479328,3 | 311 495,2 |
| 19 | Средства банков | 1202 | | 10226811,5 | 8 270 411,4 |
| 20 | Средства клиентов | 1203 | | 6565235,0 | 5 464 897,4 |
| 21 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 121980,4 | 332 433,5 |
| 22 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 683,1 | 655,2 |
| 23 | Прочие обязательства | 1206 | | 416794,0 | 324 171,9 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 17810832,3 | 14 704 064,6 |
| 25 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 1 174 075,0 | 1 174 075,0 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 245 426,9 | 245 426,9 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 487436,9 | 494 840,7 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 697994,0 | 381 908,7 |
| 31 | Всего капитал, принадлежащий головной организации-банку | | | 2 604932,8 | 2 296 251,3 |
| 32 | Доля неконтролирующих акционеров | | | 23028,3 | 19 048,7 |
| 33 | ВСЕГО капитал | 121 | | 2 627961,1 | 2 315 300,0 |
| 34 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 20438793,4 | 17 019 364,6 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2013 года

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 01.10.2013 | на 01.10.2012 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 448333,6 | 1 125393,5 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 773871,3 | 615204,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 674462,3 | 510189,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 370358,1 | 232422,1 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 100912,0 | 63496,7 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 269446,1 | 168925,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | (196,3) | 367,7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 22825,0 | 333,7 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 47234,8 | 96188,2 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (20673,4) | (63824,2) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 175786,0 | 89 666,2 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 195223,1 | 173158,1 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 543302,2 | 423367,4 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 80561,8 | 53149,1 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 388671,6 | 319155,3 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 74358,9 | 49970,8 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 314312,7 | 269184,5 |
| 18 | Базовая прибыль на простую акцию | | | - | - |
| 19 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |
| 20 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | 1 772,6 | 3101,0 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 22 | Итого прибыль (убыток) | | | 316085,3 | 272285,5 |
| 23 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 302230,0 | 260266,8 |
| 24 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 13855,3 | 12018,7 |

**И.о.Председателя Правления** **О.Г.Прохорчик**

**Главный бухгалтер** **Л.А.Филиппова**

**Дата подписания 28 ноября 2013 года**

Консолидированная отчетность по банковскому холдингу включает в себя отчетность ОАО «Банк БелВЭБ», его дочерних компаний УСП «Белвнешстрах», СЗАО «Международный энергетический центр», КСО «Внешэкономстрой» ООО и ассоциированной компании ЗАО «Сивельга».

Консолидированная отчетность размещена на сайте **www.bveb.by** в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2013 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 19.04.2013 № 6. УНП 100010078.*

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:

**Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29.**

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ на 30 сентября 2013

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 30 сентября 2013 года)

| | 30.09.2013 | 31.12.2012 |
|---|---|---|
| **Активы** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 2,278,440 | 2,553,607 |
| Драгоценные металлы | 13,325 | 10,482 |
| Финансовые активы, переоцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток | - | - |
| Торговые финансовые активы, предоставленные в качестве обеспечения по соглашениям РЕПО | - | - |
| Производные финансовые активы | 30,033 | 227 |
| Средства в кредитных организациях | 718,020 | 726,740 |
| Кредиты клиентам | 13,408,276 | 11,865,854 |
| Инвестиционные финансовые активы: | | |
| - имеющиеся в наличии для продажи | 1,681,952 | 1,334,154 |
| - удерживаемые до погашения | - | - |
| Инвестиционные финансовые активы, предоставленные в качестве обеспечения по соглашениям РЕПО | | |
| - имеющиеся в наличии для продажи | - | - |
| - удерживаемые до погашения | - | - |
| Инвестиции в ассоциированные компании | 31,981 | 29,852 |
| Основные средства | 669,271 | 630,015 |
| Активы, построенные для продажи | 207,063 | 265,896 |
| Нематериальные активы | 118,175 | 93,929 |
| Текущие активы по налогу на прибыль | 45,299 | 12,621 |
| Отложенные активы по налогу на прибыль | 3,562 | 25,833 |
| Прочие активы | 253,364 | 193,974 |
| **Итого активы** | **19,458,761** | **17,743,184** |
| **Обязательства** | | |
| Задолженность перед Правительством РФ и Банком России | - | - |
| Средства кредитных организаций | 9,968,875 | 8,825,314 |
| Финансовые обязательства, переоцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток | 1,487 | 30,047 |
| Средства клиентов | 6,330,838 | 5,696,262 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 121,980 | 365,598 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | 65,450 | 73,926 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 17,281 | 19,309 |
| Резервы | - | - |
| Прочие обязательства | 266,166 | 174,828 |
| **Итого обязательства** | **16,772,077** | **15,185,284** |
| **Капитал** | | |
| Уставный капитал | 3,843,571 | 3,843,571 |
| Эмиссионный доход | 3,721 | 3,721 |
| Собственные акции, выкупленные у акционеров | - | - |
| Дополнительный капитал | 44,568 | 44,568 |
| Нереализованная переоценка инвестиционных финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи | - | 17,883 |
| Фонд пересчета иностранных валют | - | - |
| Накопленный дефицит | (1,272,525) | (1,419,708) |
| **Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка** | **2,619,335** | **2,490,035** |
| **Неконтрольные доли участия** | **67,349** | **67,865** |
| **Итого капитал** | **2,686,684** | **2,557,900** |
| **Итого обязательства и капитал** | **19,458,761** | **17,743,184** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за девять месяцев, закончившихся 30 сентября 2013 года

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 30 сентября 2013 года)

| | За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2013 | За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2012 |
|---|---|---|
| **Процентные доходы** | | |
| Кредиты клиентам | 1,370,161 | 1,211,337 |
| Средства в кредитных организациях и эквиваленты денежных средств | 61,172 | 49,209 |
| Финансовая аренда | 9,980 | 15,253 |
| Инвестиционные финансовые активы | 81,438 | 129,967 |
| | **1,522,751** | **1,405,766** |
| Финансовые активы, переоцениваемые по справедливой стоимости через прибыль и убыток | - | - |
| | **1,522,751** | **1,405,766** |
| **Процентные расходы** | | |
| Средства кредитных организаций и задолженность перед Банком России | (385,773) | (352,623) |
| Средства клиентов и задолженность перед Правительством РФ | (333,415) | (353,787) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | (78,224) | (70,994) |
| | **(797,412)** | **(777,404)** |
| **Чистые процентные доходы** | **725,339** | **628,362** |
| Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты | (21,201) | (17,788) |
| Создание резерва под обесценение активов, приносящих процентный доход | (104,665) | (66,766) |
| **Чистые процентные доходы после создания резерва под обесценение активов** | **599,473** | **543,808** |
| Доходы по сборам и комиссионным | 321,092 | 242,641 |
| Расходы по сборам и комиссионным | (103,921) | (83,500) |
| **Чистые комиссионные доходы** | **217,171** | **159,141** |
| Доходы, за вычетом расходов по операциям с финансовыми инструментами, переоцениваемыми по справедливой стоимости через прибыль или убыток: | | |
| в том числе по операциям с производными финансовыми инструментами | - | - |
| в том числе нереализованная переоценка ценных бумаг | - | - |
| Доходы, за вычетом расходов по операциям с инвестиционными финансовыми активами, имеющимися для продажи | 24,753 | 414 |
| в том числе обесценение инвестиционных финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи | - | - |
| Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте: | | |
| - торговые операции (в том числе с производными финансовыми инструментами) | 93,366 | (119,297) |
| - переоценка валютных статей | (32,479) | 224,232 |
| Доля в прибыли ассоциированных компаний | 2,442 | 6,113 |
| Прочие операционные доходы | 155,235 | 285,465 |
| **Итого непроцентные доходы** | **243,317** | **396,927** |
| Заработная плата и прочие расчеты с персоналом | (300,108) | (272,746) |
| Помещения и оборудование | (51,637) | (53,652) |
| Износ основных средств | (34,688) | (28,112) |
| Налоги, отличные от налога на прибыль | (11,648) | (11,201) |
| Прочие расходы от обесценения и создания резервов | - | (58) |
| Прочие операционные расходы | (243,144) | (263,443) |
| **Итого непроцентные расходы** | **(641,225)** | **(629,212)** |
| **Прибыль до налогообложения и убытка по чистой денежной позиции** | **418,736** | **470,664** |
| Расходы по налогу на прибыль | (97,412) | (88,738) |
| Убыток по чистой денежной позиции в связи с гиперинфляцией | (164,336) | (161,430) |
| Чистые результаты по операциям с активами, предназначенными для продажи | - | - |
| **Чистая прибыль за период** | **156,988** | **220,496** |
| В том числе относящаяся к: - Акционерам Банка | 147,183 | 195,773 |
| - Неконтрольным долям участия | 9,805 | 24,723 |

**И.о. Председателя Правления** **Лузгин Н.В.**

**Заместитель главного бухгалтера** **Выхота Н.А.**

**08 ноября 2013**

Консолидированная отчетность по банковскому холдингу включает в себя отчетность ОАО «Банк БелВЭБ», его дочерних компаний УСП «Белвнешстрах», СЗАО «Международный энергетический центр», КСО «Внешэкономстрой» ООО и ассоциированной компании ЗАО «Сивельга».

Консолидированная отчетность размещена на сайте **www.bveb.by** в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2013 год.

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 19.04.2013 № 6. УНП 100010078.*

## ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

*г. Минск, ул. М. Богдановича, 129*

**сообщает, что 26 декабря 2013 года в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123, г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Утверждение разделительного баланса ОАО «Белтрубопроводстрой» в связи с реорганизацией.
2. Утверждение внесения изменений в Устав ОАО «Белтрубопроводстрой».

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, 16 декабря 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 в рабочие дни с 19 декабря 2013 г.

**Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

**Сведения по телефонам: 334-30-31, 334-33-83.**

*Совет директоров.*

УНП 100364117

белагропромбанк

традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что 17 января 2014 года *в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 06 декабря 2013 года, протокол № 35,* проводится внеочередное Общее собрание акционеров в очной форме.**

Место нахождения общества и место проведения собрания: **220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.**

**Повестка дня**

1. О досрочном прекращении полномочий членов Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».
2. О выборах нового состава Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания – 15.00.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 9 декабря 2013 года.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании, могут знакомиться с проектами решений внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Белагропромбанк» и сведениями о кандидатах в члены Наблюдательного совета начиная с 10 января 2014 года с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, будет проводиться 17 января 2014 года по месту проведения собрания с 13.00 до 14.45 при предъявлении документов, подтверждающих их полномочия.

**Телефоны для справок: 8(017) 229 64 59 или 229 63 24.**

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК** 136

**время работы Контакт-Центра Банка**
**8.00–20.00 – рабочие дни**
**8.00–18.00 – выходные и праздничные дни**

**Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.**

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

■ Прамоўленае

# «Беларусь падобна на маю радзіму»

**Да замежных спецыялістаў балельшчыкі заўжды ставяцца асабліва. Яны могуць любіць, узносіць іх одамі да неба, а могуць і тапіць у бяздонным моры крытыкі. А вось да Глена ХЭНЛАНА, галоўнага трэнера мужчынскай зборнай па хакеі, упэўнены, у нашай краіне заўжды будзе прыязнае стаўленне. З канадскім «коўчам» у нас звязана, сапраўды, і прыемнае мінулае, і думкі пра добрую будучыню на хатнім хакейным першынстве. Як яна складзецца для нас, ніхто не ведае. Аднак толькі адна навіна пра вяртанне Глена ў зборную адразу ўсяляе аптымізм у сэрцы шматлікіх заўзятараў.**

З Гленам Хэнланам мы сустрэліся зімовай раніцай у працоўным кабінеце хакейнай федэрацыі. На стале — ноўтбук, нататнік, аловак, на сцяне — планшэт з маркерамі і запісанымі прозвішчамі хакеістаў. Відавочна, што спецыяліст актыўна працуе, але мы на нейкі час адцягваем яго ўвагу ад работы, каб выклікаць успаміны пра хакей, дзяцінства, спатканне з Беларуссю…

— Першая прапанова аб супрацоўніцтве мне паступіла ў снежні 2005 года,— гартае ў памяці храналогію Глен Хэнлан.— Больш званкоў не было, і я меў час, каб падумаць над ёй. Тады я працаваў у камандзе «Вашынгтон Кэпіталз», аднак мы выступалі няўдачна і ў плэй-оф НХЛ не праходзілі. Я займаўся тым, што вывучаў беларускі варыянт. І ўжо праз месяц, калі паўторна пазваніў Уладзімір Навумаў (былы старшыня федэрацыі хакея.— **Аўт.**), я быў гатовы пагадзіцца.

**— У чалавека, які прыязджае да нас працаваць з Захаду, над рацыянальным ўспрыманнем рэчаіснасці часам дамінуюць дзіўныя стэрэатыпы: холад, мядзведзі, гарэлка і ўсё такое…**



— Не, са мной падобнага не было,— усміхаецца Глен.— Праўда, калі чытаў інфармацыю пра Беларусь, я не настолькі паглыбляўся, каб вывучаць стэрэатыпы. Я ведаў агульныя звесткі пра краіну, геаграфію, цікавіўся мясцовай кухняй… У 1972-м я глядзеў суперсерыю Канада — СССР, і пасля мне заўжды хацелася папрацаваць з камандай з постсавецкай прасторы. І я не магу сказаць, што мяне тут нешта вельмі здзівіла. Усё ж такі я прыехаў сюды ў 2005 годзе, а не ў 1965-м. Усё было даступна, як і ў іншых краінах. Моўны бар'ер? Са мной не здаралася такога, што я не мог штосьці патлумачыць афіцыянтам у рэстаране. Калі я не хацеў нешта замаўляць, дык проста не паказваў на гэта пальцам. Зараз у Беларусі па-англійску размаўляюць больш людзей, чым раней. Помню, як ездзіў на хакей у Гродна. Я мог папрасіць, каб мяне туды адвезлі. Вырашыў паехаць сам, разабрацца па знаках, каб лепш разумець мову таксама.

**— Гродна, між іншым, называюць адным з самых еўрапейскіх гарадоў Беларусі.**

— Так, у Гродне ёсць старажытная забудова. Праўда, калі мы ў Паўночнай Амерыцы размаўляем пра еўрапейскія гарады, уяўляем сабе нешта старадаўняе, як, напрыклад, гістарычныя раёны Прагі ці Браціславы. Мінск таксама выглядае па-еўрапейску. У гэтым сэнсе беларуская сталіца пайшла добрым шляхам, бо не ўсе людзі любяць вузкія дамы, вулачкі. Многім хочацца прасторы. У Мінску яе хапае паміж дамамі, у парках… Дарэчы, штат Манітоба, дзе я нарадзіўся, «па прыродзе» на 100% падобны на Беларусь. Усе гэтыя бярозы, узгоркі і раўніны, лясы, сельская гаспадарка ёсць і на маёй радзіме. Праўда, Вініпег, наш самы вялікі горад, нашмат меншы, чым Мінск.

⬩ ⬩ ⬩

— Мая маці была офісным сакратаром, а бацька працаваў на чыгунцы,— узгадвае суразмоўца і робіць вуснамі характэрны для лакаматыва гук «Чу-чух!»

**— Вы сталі ў сям'і спартыўным піянерам?**

— У нашым радаводзе не было спартсменаў. Спортам займаўся мой брат, гуляць з якім мне вельмі падабалася.

**— Глен, а што такое гуляць у хакей у 1960-я ў невялічкім горадзе, які размешчаны за 215 кіламетраў ад сталіцы штата?**

— Калісьці ў дзяцінстве я назіраў праз акно за тым, як хлопчыкі гулялі на вуліцы. Яны будавалі снежныя кучы, якія замянялі ім вароты, і ганялі каля іх шайбу. Гэта было выдатна! Дзеці былі без бацькоў, гарэзавалі ўсю ноч, і ніхто іх не клікаў дадому, не ставіў у кут. Сёння ў Канадзе падобнае ўбачыш зрэдчас. Затое ў Беларусі я часта назіраю тое, што ў Канадзе было раней — у маім дзяцінстве і маладосці. У нас тады не было такіх спецыялізаваных хакейных школ, як ДЮСШ у Беларусі. Мы проста не мелі падобнай структуры.

**— Савецкія хлопчыкі, напрыклад, марылі быць касманаўтамі, як Юрый Гагарын. А кім хацеў стаць маленькі канадзец?**

— Хакей — вялікая спадчына для Канады. Мяркую, большасць канадскіх хлопчыкаў у розныя перыяды свайго жыцця марылі стаць прафесійнымі хакеістамі. У Канадзе, безумоўна, гуляюць у бейсбол, футбол, баскетбол, але гэтыя віды спорту не настолькі папулярныя ў нас, як хакей і лакрос.

**— Тады зразумела, што вашай любімай цацкай у дзяцінстве была клюшка.**

— Так, усё маё жыццё звязана з хакеем.

**— Цікава, што першую маску варатару Андрэю Мезіну на заводзе змайстраваў бацька. А які лёс у вашага хакейнага шлема?**

— Спачатку мы гулялі наогул без масак. Аднойчы мой брат трапіў шайбай мне ў галаву і я крыху параніўся. Маці ўбачыла ўсё гэта і сказала бацьку: «Схадзі ў краму і набудзь яму маску. Ён усё роўна будзе гуляць у хакей. Неабходна, каб гэта было бяспечна». З 19 гадоў пачаў гуляць у варотах у так званай «масцы Траццяка».

**— Дарэчы, шмат пішуць пра тое, што ў 1979 годзе вы прапусцілі першую шайбу ў кар'еры Уэйна Грэцкі, якога часопіс «The Hockey news» прызнаў лепшым хакеістам у гісторыі НХЛ.**

— Так, толькі для варатара нядобра станавіцца знакамітым толькі таму, што ты прапусціў шайбу. Няхай і ад самога Уэйна Грэцкі.

**— Многім заакіянскім хакеістам прыйшлося выступаць толькі на ўзроўні ніжэйшых хакейных ліг, якіх шмат у Паўночнай Амерыцы. Вы добра пагулялі ў НХЛ. Ці задаволены сваёй біяграфіяй хакеіста?**

— Задаволены. 14 гадоў я выступаў на вышэйшым узроўні — у НХЛ. Каля 20 гадоў я толькі трэніраваўся і гуляў у хакей, што дазваляла мне заставацца на топ-узроўні ў лепшай лізе. Як толькі я завяршыў кар'еру, перажываў, што не заваяваў Кубак Стэнлі. Потым зразумеў: ёсць шмат сапраўды вялікіх гульцоў, якія таксама не заваёўвалі кубак. Таму мяне гэтае пытанне сёння зусім не клапоціць.

**— Сучасныя хакеісты НХЛ удзельнічаюць у фотасесіях, ток-шоу, даюць шмат інтэрв'ю, іх запрашаюць на свецкія тусоўкі. Што замяняла ў ваш час падобную раскошу?**



**Як толькі я завяршыў кар'еру, перажываў, што не заваяваў Кубак Стэнлі. Потым зразумеў: ёсць шмат сапраўды вялікіх гульцоў, якія таксама не заваёўвалі кубак. Таму мяне гэтае пытанне сёння зусім не клапоціць.**

— Калі мы бачым хакеіста на публічным мерапрыемстве — гэта адзіны выпадак. Часта падобнае не здараецца. Кожны дзень складаецца з руціны. Яны прачынаюцца, снедаюць, ідуць на трэніроўку… Увесь дзень праводзяць на катку і вечарам вяртаюцца ў сям'ю. У іх аднастайнае жыццё, і нельга сказаць, што яно гламурнае. А тое, што зарабляюць больш за іншых, яны цэняць і не ўспрымаюць, як належнае. Магчыма, гэта кампенсацыя за іх цяжкі, аднастайны лад жыцця.

**— Між іншым, многія ў беларускім інтэрнэце пішуць, што айчынныя хакеісты хоць і гуляюць не вельмі добра, але зарабляюць добрыя грошы.**

— Штосьці новае я вам не скажу. Так было заўжды. Мяркую, што і ў часы Савецкага Саюза топ-гульцы таксама атрымлівалі прывілеі.

**— Ці заўважылі розніцу ў менталітэце хакеістаў, калі працавалі са славакамі, канадцамі, амерыканцамі, беларусамі і фінамі?**

— Ад зборных Канады, Расіі, Швецыі, Фінляндыі заўжды чакаюць медалёў, перамог. І любы іншы вынік расцэньваецца як няўдача. У Славакіі і Фінляндыі, дзе я таксама працаваў, хакей — гэта спорт № 1. А ў Беларусі я ўсё яшчэ не зразумеў, які від — футбол ці хакей — больш папулярны сярод жыхароў краіны. Жаданні і ўспрыманне ва ўсіх краінах амаль аднолькавае: усе хочуць паляпшацца. Запал, з якім беларусы «хварэюць» і рэагуюць на тое, што адбываецца на лёдзе, вельмі-вельмі падобны на эмоцыі фінскіх і славацкіх балельшчыкаў.

⬩ ⬩ ⬩

**— Канадзец Коры Мёрфі, які летась гуляў за «Дынама», неяк прызнаўся мне, што любіць кантры, традыцыйную музыку для Паўночнай Амерыкі. А на якой музыцы гадаваліся вы?**

— Таксама на кантры. Манітоба — аграрны штат. І шмат фермераў любяць супольна збірацца разам, размаўляць і слухаць падобную музыку. Мне яшчэ падабаецца слухаць у аўтамабілі «Радыё Рокс»,— у гэты момант Глен уключае некалькі спакойных і танцавальных рускамоўных кампазіцый на сваім камп'ютары.— Руская музыка ўздымае мне настрой.

Праз некалькі секунд у кабінеце загучала кампазіцыя «Брыльянты» гурта ВІА ГРА.

**— Глен, гэтая песня пра дзяўчат, якія любяць брыльянты…**

— Сур'ёзна? Шчыра кажучы, я не разумею слоў, але сама музыка мне падабаецца.

***За арганізацыю і правядзенне інтэрв'ю «Звязда» выказвае падзяку Ягору Галаванёву, генеральнаму сакратару Федэрацыі хакея Беларусі.***

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота Надзеі БУЖАН**

### Даведка «Звязды»

*Глен ХЭНЛАН нарадзіўся 20 лютага 1957 г. у горадзе Брандон (штат Манітоба, Канада). Правёў 14 сезонаў у Нацыянальнай хакейнай лізе. Выступаў за «Ванкувер Кэнакс», «Сэнт-Луіс Блюз», «Нью-Ёрк Рэйнджэрс», «Дэтройт Рэд Уінгз». Працаваў асістэнтам і галоўным трэнерам «Вашынгтон Кэпіталз», зборнай Славакіі, фінскай каманды «Ёкерыт», мінскага «Дынама». Ён ужо двойчы ўзначальваў зборную Беларусі, а ў 2006 годзе пад яго кіраўніцтвам яна заняла 6-е месца на чэмпіянаце свету, якое стала рэкордным для нашай нацыянальнай каманды на планетарных турнірах. З 1 ліпеня 2013 года Хэнлан зноў на капітанскім мосціку зборнай Беларусі.*



Фота БЕЛТА.

Даты | Падзеі | Людзі

**37** год — нарадзіўся рымскі імператар Клаўдзій Цэзар Нерон. Ён лічыў сябе вялікім акцёрам. Дэкарацыі яго спектакляў былі абсыпаны ружамі і заліты крывёю нявінных ахвяр. Неапаль уздрыгнуў ад землятрусу ў час яго дэбюту на сцэне. Апафеозам новай трагедыі стаў падпалены Рым. Яго гараскопы прадвяшчалі свету жах і гора. Яго ахвярамі сталі блізкія сваякі, родная маці, дзве жонкі, апосталы Пётр і Павел, пісьменнік Пятроній і філосаф Сенека.

**1911** год — Руаль Амундсен першым дасягнуў Паўднёвага полюса. «Сіла волі — першая і найважнейшая якасць скрупулёзнага даследчыка. Толькі ўмеючы кіраваць сваёй воляй, ён можа пераадолець перашкоды, якія прырода ставіць на яго шляху»,— гэтыя словы належаць нарвежскаму палярнаму даследчыку Руалю Амундсену. Дзякуючы сіле волі яму ўдалося шмат чаго дасягнуць у жыцці. Адно з самых вялікіх яго дасягненняў — усталяванне нарвежскага сцяга на Паўднёвым полюсе Зямлі. Экспедыцыя, якую ўзначальваў Амундсен, трапіла туды 14 снежня 1911 года. А пачалося ўсё ў студзені, калі вандроўнікі дабраліся з Нарвегіі да лядовага бар'ера Роса ў Антарктыдзе. Перазімаваўшы, яны прайшлі на сабачых запрэжках паўтары тысячы кіламетраў. Дадому даследчыкі вярталіся як нацыянальныя героі.



**1945** год — Аб'яднаны камітэт ваеннага планавання ЗША выдаў дырэктыву № 432/д аб падрыхтоўцы атамнай бамбардзіроўкі дваццаці асноўных палітычных і прамысловых цэнтраў Савецкага Саюза. З сярэдзіны 1945 года і па 1953-ці амерыканскае ваенна-палітычнае кіраўніцтва ў пытаннях будаўніцтва стратэгічных ядзерных сіл зыходзіла з таго, што ЗША манапольна валодаюць ядзернай зброяй і могуць дасягнуць сусветнага панавання шляхам ліквідацыі СССР у ходзе ядзернай вайны. Падрыхтоўка да такой вайны пачалася практычна адразу пасля разгрому гітлераўскай Германіі і атамнай бамбардзіроўкі японскіх гарадоў. Дырэктывай ад 14 снежня для бамбавання найважнейшых савецкіх гарадоў планавалася выкарыстоўваць увесь наяўны на той час запас атамных бомбаў (196 штук), носьбітамі якіх з'яўляліся мадэрнізаваныя бамбардзіроўшчыкі У-29. Вызначаўся і спосаб іх прымянення — раптоўны атамны «першы ўдар», які павінен паставіць савецкае кіраўніцтва перад фактам бесперспектыўнасці далейшага супраціўлення. Палітычным абгрунтаваннем такіх дзеянняў стаў тэзіс аб «савецкай пагрозе».

Было сказана

**Апанас ФІЛІПОВІЧ,**
**царкоўны дзеяч, пісьменнік-палеміст:**

***«Малы абраз, але вялікі цудамі сваімі».***

Дарагая пляменніца
**Ганна Віктараўна ТУРБІНСКАЯ**
з Магілёва!
Прымі мае сардэчныя віншаванні з нагоды юбілейнага дня народзінаў.
Зычу ўсяго самага добрага ў сям'і, здароўя, павагі ад родных і калег. Дзякуй за добрасумленную працу на ніве народнай асветы.
**З павагай, Новік Т.І.**



## ДЗЕ ЎПАЎ МЕТЭАРЫТ?

Беларусы ў 2013 годзе часцей за ўсё шукалі на «Яндэксе» інфармацыю аб падзенні метэарыта ў Чалябінску. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кампаніі «Яндэкс».

На другім месцы аказалася ўспышка афрыканскай чумы свіней у Беларусі. Вялікую цікавасць у беларусаў таксама выклікаў развод прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. У «пяцёрку» трапілі нараджэнне дзяцей у спявачкі Алы Пугачовай і парадыста Максіма Галкіна і прыбыццё ў Мінск Крыжа Андрэя Першазванага.

Беларусы таксама актыўна цікавіліся падзеямі ў Паўночнай Карэі, сачылі за канфліктам у Сірыі і чакалі гастроляў Cirque du Soleil у Мінску. У ліку падзей года таксама чэмпіянат свету па хакеі 2014 года.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЫХТУЕМСЯ ДА СВЯТА

## Хатні селядзец

***Спатрэбіцца:*** *морква — 1 шт., цыбуля — 2 шт., селядзец (свежамарожаны) — 2 шт., гарчыца (у зернях) — 1 ч.л., соль — 1 ч.л., перац чорны (гарошкам) — 10 шт., цукар — 1 ч.л., алей сланечнікавы (нерафініраваны) — 150 мл.*

Селядзец размарозіць не да канца, адрэзаць галаву, выдаліць вантробы, памыць.

Парэзаць цыбулю кольцамі, моркву скрылёчкамі, селядзец кавалачкамі.

У шкляную ёмістасць, чаргуючы, выкладваем цыбулю, моркву, гарчыцу, перац, селядзец, соль, цукар.

Заліваем алеем, закрываем шчыльна ёмістасць і трасем.

Ставім селядзец у халадзільнік на 1–2 гадзіны — і можна падаваць на стол.

## Капуста «Заўтра госці»

***Спатрэбіцца:*** *капуста квяцістая — каля кілаграма, цукар — 150 г, соль — 1 ст.л., воцат — 150 мл, алей — 150 г, каляндра (молатая) — 1 ст.л., часнок — 4 зуб., морква — 1 шт., вада — 600 г, перац чорны — 1 ч.л.*

Капусту разабраць на суквецці, моркву нарэзаць кубікамі, часнок аблупіць. Усё закласці ў двухлітровы слоік. Вада + соль + цукар + воцат + алей + каляндра + чорны перац = марынад. Марынад закіпяціць і заліць капусту. На наступны дзень можна есці! Захоўваць у халадзільніку.

## Рулет з трох відаў мяса

***Спатрэбіцца:*** *спецыі, соль, перац чорны, зеляніна сухая — кроп, пятрушка, асарці агароднінна замарожанае — 400 г, чарнаслiў — 200 г, курыца — 300 г, свініна — 500 г, ялавічына — 700 г.*



Мяса пасаліць днём раней з заправамі і чорным молатым перцам. Праз суткі мяса адбіць. Сцелім на стале фольгу. Раскласці адбітае мяса на фольгу, выкласці чарнаслiў і агароднінае асарці. Зверху пасыпаць сухой зелянінай (кроп, пятрушка). Пры дапамозе фольгі скруціць мяса ў шчыльны рулет. Краі фольгі загарнуць як цукерку і паставіць на бляхе ў разагрэтую духоўку пры тэмпературы 180°С на 40 хвілін. Затым тэмпературу зменшыць да 150°С і пакінуць яшчэ на 20 хвілін. Са смятаны, кетчупу, гарчыцы і часнаку можна зрабіць соус да рулета.

Рулет добры ў гарачым відзе як другая страва з гарнірам, а ў халодным — як закуска.

-2984-

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Навагодняя паштоўка сваімі рукамі

**Паштоўкі ручной работы заўсёды высока цэняцца. Таму напярэдадні Новага года праявіце трохі ўвагі да сваіх блізкіх, зрабіўшы для іх навагоднія паштоўкі сваімі рукамі. Гэта дазволіць вам стварыць вельмі прыгожыя падарункі, якія яшчэ раз падкрэсляць, наколькі гэтыя людзі дарагія вам.**

Матэрыялы: каляровы кардон, каляровая папера, клей, пэндзлі, нажніцы.

Крок 1. Выражце з зялёнай каляровай паперы доўгія палоскі рознай шырыні, а з чырвонай — зорку.



Крок 2. Складзіце зялёныя палоскі гармонікам і прыклейце да паштоўкі, склаўшы яе ўдвая.

Крок 3. Па чарзе прыклейваючы палоскі, фарміруйце ялінку. Затым прыклейце зорку.

Крок 4. Пакіньце паштоўку высыхаць. Калі клей высахне, можаце падпісаць яе.

ГАСПАДАР У ДОМЕ

## Як правільна завастрыць нож

Заўсёды бывае прыкра, калі нож не можа разрэзаць хлеб, не раскрышыўшы яго пры гэтым. Рашэнне гэтай праблемы — востры нож. Спатрэбіцца толькі крыху вольнага часу, тачыльны камень і кавалачак наждачнай паперы.

Змочваем наш камень для завострывання. Можна выкарыстаць трохі алею, але тады не налівайце вады. Гэта дапаможа супраць закаркоўвання паверхні каменя металічным пылам.

Кладзем камень на роўную паверхню стала. Уявіце, што нам трэба адрэзаць кавалачак гэтага каменя. Уявілі? А цяпер «рэжам камень», але не перашчыруйце! Точым у 3 заходы па 3 разы (каля 9 упэўненых рухаў) на адзін бок нажа. Робім тое ж з другім бокам нажа.

Спалоскваем нож і правяраем яго вастрыню на якім-небудзь мяккім прадмеце (падыдзе хлеб).

Адшліфуйце ножык з 2-х бакоў. Можна выкарыстоўваць і кавалачак скуры, але наждачная папера, пачынаючы з зярністасці ад 100, 800 і да 1200, падыдзе куды лепш.

Усё. Нож гатовы да нарэзкі любога хлеба ці сыру.

-2985-

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.21 | 16.47 | 7.26 |
| Віцебск | — 9.18 | 16.29 | 7.11 |
| Магілёў | — 9.11 | 16.37 | 7.26 |
| Гомель | — 8.59 | 16.42 | 7.43 |
| Гродна | — 9.35 | 17.04 | 7.29 |
| Брэст | — 9.27 | 17.13 | 7.46 |

### Месяц

*Поўня 17 снежня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.*** *Навума.*
***К.*** *Альфрэда, Ізыдара, Яна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Муж — жонцы:

— Дарагая, давай, каб не спрачацца, што глядзець па тэлевізары, паглядзім фігурнае катанне.

— Добра, а хто катаецца?

— «Дынама» і СКА...

**Мая жонка храпе, як п'яны матрос. Паехаў у камандзіроўку. Усвядоміў, што не магу спаць у цішыні. Прыехаў дадому. Выспаўся.**

Дзве сяброўкі:

— Мне хутка 30 гадоў, а я ўсё не замужам.

— Так, камусьці моцна пашанцавала...



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ**: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:** Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

**НАШ АДРАС**: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by,

**(для зваротаў):** zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.328. Індэкс 63850. Зак. № 5381.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2013 года.